XVIII
9892 XII

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА

БЕЛАРУСІ

№ 28 (17)

АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ПАВЫШЭНЬНІ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б)

Дзякуючы посьпехам калектывізацыі калгаснае сялянства ў асноўных сельскагаспадарчых раёнах аб'яднала 80—90 проц. зямлі, якая знаходзілася раней у аднаасобным карыстаньні. Дробныя палоскі аднаасобных гаспадарак з іх далёказямельлем, праспалосіцай, пастаяннымі перадзеламі зямлі аб'яднаны зараз калгасным сялянствам у буйныя масывы. Арганізавана магутная сетка саўгасаў. Сельская гаспадарка атрымала больш 100 тыс. трактараў.

У рэзультаце ўсяго гэтага пасеўныя плошчы па СССР выраслі, параўнальна з даваеннымі, на 30 млн. гэктараў, асабліва па тэхнічных і прапашных культурах і травах.

Але з гэтага вынікае, што пасеўныя плошчы **пашыраны выстарчальна**, і мэта першай стадыі ўздыму сельскай гаспадаркі—найбольшае пашырэньне плошчаў—ужо ажыцьцёўлена. Далейшае пашырэньне пасеўных плошчаў па тэхнічных і прапашных культурах, якія зьяўляюцца найбольш працаёмкімі, выклікала-б празьмерную перагрузку рабочай сілы і цягі, пагоршаньне якасьці апрацоўкі і падзеньня ўраджайнасьці. Гэта значыць, што наступіў час, калі ад **росту гаспадаркі ўшыркі**, шляхам павялічэньня пасеўных плошчаў, неабходна **павярнуць** да барацьбы за лепшую апрацоўку зямлі, да барацьбы за **павышэньне ўраджайнасьці**, як галоўнай і цэнтральнай задачы ў галіне сельскай гаспадаркі на данай стадыі разьвіцьця. Перавагі буйнай сацыялістычнай гаспадаркі даюць поўную магчымасьць павысіць ураджайнасьць у саўгасах і калгасах у разьмерах, недаступных аднаасобнай гаспадарцы.

У сувязі з гэтым **Савет Народных Камісараў Саюзу ССР і Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пастанаўляюць:**

1. **Прыпыніць** далейшае пашырэньне плошчаў тэхнічных і прапашных культур па пляну 1933 г. і прызнаць мэтагодным пашырэньне плошчаў толькі па збожжавых (галоўным чынам па пшаніцы, аўсу, ячменю).

2. Устанавіць плян яравой сяўбы к вясьне 1933 г. у разьмеры 97½ млн. гэкт. (на мільён *га* больш гэтага году) з тым, каб плошчы пад пшаніцай, аўсом і ячменем выраслі на 2½ млн. гэкт., з якіх 1 млн. гэкт. за кошт агульнага прыросту плошчаў у 1933 г., а 1½ млн. гэктараў—за кошт выцясьненьня іншых, менш важных культур.

3. Пераключыць работу ўсіх партыйна-савецкіх, камсамольскіх і гаспадарчых арганізацый, працуючых, у галіне сельскай гаспадаркі,—у напрамку **павышэньня ўраджайнасьці** па ўсіх бяз выключэньня культурах, як цэнтральнай задачы разьвіцьця сельскай гаспадаркі ў даны момант.

4. Даручыць Наркамзему СССР у працягу 1933 г. увесьці ва ўсіх саўгасах і калгасах **севазварот**, як адзін з лепшых сродкаў павышэньня ўраджайнасьці, з тым, аднак, каб увядзеньне севазвароту было зьвязана з адпаведным пашырэньнем у пэўных абласьцях і краёх плошчаў пад збожжавымі каласавымі культурамі.

5. Давесьці ў 1933-1934 г. **гатунковы фонд збожжавых** культур да 100 млн. пудоў, у тым ліку 40 млн. пудоў дзяржаўнага і 60 млн. пудоў унутры МТС нага міжкалгаснага абменнага фонду, даручыўшы Наркамзему СССР устанавіць насеннае раёнаваньне і распрацаваць мерапрыемствы па пераходу на пасеў чысгатунковым насеньнем па культурах і раёнах.

6. Даручыць Наркамзему і Наркамцяжпраму ў двухгыднёвы тэрмін увайсьці ў СНК СССР з канкрэтнымі прапановамі аб вырабе да сэзону 1933 г. неабходнай колькасьці машын для **мэханізацыі тэхнічных і прапашных культур**, як аднаго з лепшых сродкаў для ўзьняцьця ўраджайнасьці.

7. Даручыць Наркамзему СССР і Наркамцяжпраму ў 3-тыднёвы тэрмін увайсьці ў СНК Саюзу ССР з прапановай па ўзмацненьні вытворчасьці хэмічных угнаеньняў, асабліва азотных, неабходных для ўзняцьця ўраджайнасьці.

8. Даручыць Наркамзему СССР і Трактарацэнтру перабудаваць работу машына-трактарных станцый так, каб задачы барацьбы за ўраджайнасьць была падпарадкавана бягучая агра-вытворчая работа МТС, маючы на ўвазе, што машына-трактарныя станцыі павінны стаць кіраўнікамі калгасаў ня толькі ў галіне ўжываньня трактарнай тэхнікі, але і ў галіне **агранаміі**.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР **В. Молатаў (Скрабін).**

Сакратар Цэнтральнага Камітэту ЎсеКП(б) **І. Сталін.**

1932 г. 29-IX.

На вокладцы: Калгасьніцы за ўборкай бульбы.

XVIII
9892

ДЕРЖАВНА ПУБЛІЧНА БІБЛІОТЕКА ім. ОДЕСА
23 3 73

17/163/XII

Максім Горкі з унучкай

Н. К. Крупская

Ленін і Горкі

Уладзімер Ільліч вельмі цаніў Аляксея Максімавіча Горкага, як пісьменьніка. Асабліва падабаліся яму „Мать", артыкулы ў „Новой Жизни" аб мяшчанстве, — сам Уладзімер Ільліч ненавідзеў усякае мяшчанства,—падабалася „На дне", падабаліся песьні аб Сокале і Буравесьніку, іх настрой, любіў ён таксама творы Горкага, як „Страсти молодости", як „Двадцать шесть и одна".

Памятаю, як загарэўся Ільліч неяк жаданьнем пайсьці ў Мастацкі тэатр глядзець „На дне", памятаю, як слухаў ён „Мои университеты" ў апошнія дні свайго жыцьця.

Горкі пісаў больш за ўсё аб рабочых, аб гарадзкой беднаце, аб „дне", аб тых пластох, якія больш за ўсё цікавілі Ільліча, апісваў жыцьцё так, як яно ёсьць, ва ўсёй яго канкрэтнасьці, бачыў яго вачыма чалавека, які ненавідзіць уціск, эксплёатацыю, убогасьць мысьлі—вачыма рэвалюцыянэра. І тое, што пісаў Горкі, было блізка і зразумела Ільлічу.

Сам Уладзімер Ільліч прагна ўглядаўся ў жыцьцё, ва ўсе дробязі. Гэта ўменьне Ільліча заўважваць дробязі і асмысьліваць іх адзначыў Горкі ў адным лісьце да мяне (ад 1930 г.), дзе ён пісаў:

„Вельмі ярка ўспомніўся візыт мой у Горкі ўлетку, здаецца, 20-га году, жыў я ў той час паза палігыкай, па вушы ў „быце" і скардзіўся Ул. І. на засільле дробязяй жыцьця. Гаварыў, між іншым, аб тым, што, разьбіраючы драўляныя дамы на апал, ленінградзкія рабочыя ламаюць рамы, б'юць шкло, марна псуюць дахавае жалеза,

а ў іх дамох дахі цякуць, вокны забіты фанэрай і г. д. Абурала мяне нізкая ацэнка рабочымі прадуктаў сваёй-жа працы. „Вы, У. І., думаеце шырокімі плянамі, да вас гэтыя дробязі не даходзяць". Ён памаўчаў, гуляючы па тэрасе, а я папракнуў сябе: дарэмна дакучаю глупствам. А пасьля чаю пашлі мы з ім гуляць, і ён сказаў мне: „Дарэмна думаеце, што я не надаю значэньня дробязям, дый ня дробязь гэта—адзначаная вамі недаацэнка працы, зразумела, ня дробязь. Мы бедныя людзі і павінны разумець цану кожнага палена і гроша. Разбурана многа, трэба вельмі берагчы ўсё тое, што засталося, што неабходна для аднаўленьня гаспадаркі. Але як абвінаваціць рабочага за тое, што ён яшчэ не ўсьвядоміў, што ён ужо гаспадар свайго, што ёсьць. Усьведамленьне гэта зьявіцца ня скора і можа зьявіцца толькі ў сацыяліста". Гаварыў ён на гэту тэму вельмі доўга, і я быў зьдзіўлен тым, як многа ён бачыў „дробязяй" і як дзіўна проста мысьль яго выходзіць ад мізэрных бытавых зьявішч да найшырэйшых абагульненьняў. Гэта яго здольнасьць, на дзіва тонка распрацаваная, заўсёды зьдзіўляла мяне. Ня ведаю чалавека, у якога аналіз і сінтэз працавалі-б так гарманічна".

У тым-жа лісьце А. М. пісаў: „Гутарачы са мной на Капры аб літаратуры тых год, ён надзвычай метка характарызаваў пісьменьнікаў майго пакаленьня, бязьлітасна і лёгка агаляў іх сутнасьць".

Ільліч добра ведаў рускую літаратуру—яна была для яго прыладай пазнаньня жыцьця. І чым паўней, усебаковей, глыбей адлюстроўвалі мастацкія творы жыцьцё, чым прасьцей яны былі, тым больш цаніў іх Ільліч.

Уладзімер Ільліч блізка пазнаёміўся з Горкім у 1907 г. на Лёнданскім партыйным зьезьдзе, наглядаючы там за ім, пагаварыў з ім і неяк душэўна зблізіўся з ім. Цікавы лісты Ільліча да Горкага за час другой эміграцыі. Вобраз Ільліча, як чалавека, асабліва ярка выступае ў гэтых лістох. Ільліч піша Горкаму з рэзкай простасьцю аб тым, з чым ён ня згодзен, што яго хвалюе, турбуе. Ільліч звычайна так пісаў таварышом, але ў лістох да Горкага ёсьць асаблівае адценьне. Піша ён часта вельмі рэзка, але ў гэтай рэзкасьці многа нейкай асаблівай мяккасьці. Лісты пішуцца заўсёды пад непасрэдным уражаньнем якога-небудзь факту, у іх многа эмацыянальнасьці—ярка адлюстравана трывога, цяжкасьць некаторых перажываньняў, радасьць надзеі. Ільлічу здавалася, што Горкі вельмі добра ўсё гэта зразумее. І заўсёды хацелася таксама Ільлічу пераканаць Горкага ў правільнасьці сваіх поглядаў, ён горача абараняў іх.

У лістох Леніна да Горкага відаць клопаты Ільліча аб ім. Усе ведаюць, як уважліва адносіўся Ільліч да людзей, умеў клапаціцца аб іх. І Аляксей Максімавіч сам ня раз пісаў аб гэтым. Адзначалі гэта ўсе.

Турбавала Ільліча здароўе Аляксея Максімавіча. Ён заўсёды пытаўся пра яго, даваў парады лячыцца абавязкова ў першаклясных дактароў, захоўваць рэжым („прижим", як жартаваў Ільліч), не працаваць начамі.

У эміграцыі Ільліч вельмі сумаваў аб тым, што прыходзіцца мала бачыць рабочых. Праўда, у эміграцыі было многа рабочых, але яны звычайна хутка паступалі на работу і жылі ўжо мясцовымі французскімі або швэйцарскімі інтарэсамі, і жыцьцё ў эміграцыі вельмі хутка накладала на іх свой адбітак. Таму ён заўсёды быў рад рабочым, якія прыяжджалі за граніцу не надоўга. Ільліч быў вельмі задаволен работай з рабочымі з капрыйскай школы, з вучнямі партыйнай школы ў Лёнжумо. У 1913 г. меркаваўся прыезд у Паронін (у Галіцыю, каля Кракава) рабочых дэпутатаў. Горкі на Капры меў яшчэ меншую магчымасьць трымаць сувязь з рускімі рабочымі, і Ільліч ясна сабе ўяўляў, як гэта яму цяжка. Ён пачаў яго клікаць у Паронін. „Калі здароўе дазволіць, махнеце не надоўга. Пасьля Лёндану і школы на Капры пабачыў-бы яшчэ рабочых".

У мяне захаваўся адзін ліст Ільліча ад чэрвеня 1919 г. Я езьдзіла тады на агітацыйным параходзе „Красная Звезда", пісала Ільлічу аб першых сваіх уражаньнях, і Ільліч надумаў, што добра-б і Горкага пусьціць так паезьдзіць. „Я запытаўся тэлеграмай,—пісаў ён,—ці нельга на „Красной Звезде" даць каюту для Горкага. Ён прыедзе сюды заўтра, і я вельмі хацеў-бы выцягнуць яго з Піцеру,, дзе ён знэрваваўся. Спадзяюся, ты і іншыя таварышы будзеце рады ехаць з Горкім. Ён хлапец вельмі мілы".

Я мала бачыла Ільліча разам з Горкім.

На Лёнданскім зьезьдзе я ня была, на Капры ня езьдзіла, а ў Парыжы, Маскве, Горках, калі да нас прыяжджаў Аляксей Максімавіч, я заўсёды старалася змыцца, каб даць ім пагаварыць па душах, сам-на-сам.

Зараз Аляксей Максімавіч жыве ў СССР, жыве па вушы ў палітыцы, піша гарачыя публіцыстычныя артыкулы, бачыць рабочых колькі хоча. Мне яго рэдка даводзіцца бачыць, хаця часамі вельмі хочацца пагаварыць з ім аб Ільлічу, але жыцьцё ў нас вельмі напружанае, усе працуюць, не пакладаючы рук. У Аляксея Максімавіча многа кіруючай работы ў галіне літаратуры, якую ніхто, апрача яго, ня можа выканаць.

Гарачае, таварыскае прывітаньне!

Прывітаньне ЦК УсеКП(б) Максіму Горкаму

ЦК УсеКП(б) горача вітае вялікага пралетарскага пісьменьніка Максіма Горкага.

Сваімі выдатнымі мастацкімі творамі, стаўшымі здабыткам мільённых мас, Горкі „модна зьвязаў сябе з рабочым рухам Расіі і ўсяго сьвету" (Ленін).

Імя Максіма Горкага дорага і блізка працоўным Савецкай краіны і далёка за яе межамі, як імя найвялікшага мастака-рэвалюцыянэра, барацьбіта супроць капіталізму, за міжнародную пралетарскую рэвалюцыю, за вызваленьне працоўных усіх краін ад уціску капіталізму.

ЦК УсеКП(б) выказвае ўпэўненасьць, што вялікі талент Горкага і яго рэвалюцыйная энэргія будуць яшчэ доўга служыць справе рабочай клясы.

ЦК УсеКП(б).

Максім Горкі

(Кароткі жыццяпіс)

Дзяцінства і юнацтва Горкага прыпалі на 70—80 гады, часы глухой рэакцыі, калі фэадальна-паліцэйская раманаўская манархія, зьвязаная з капіталізмам адсталага, „азіяцкага" тыпу, рабіла падвойны ўціск на масы сялян і рабочых.

Горкі рос у доме свайго дзеда, уласьніка маленькага фарбавальнага завядзеньня ў Н.-Ноўгарадзе. Кашарын (дзед Горкага) „выбіўся ў людзі" з бурлакоў, але хутка зусім зьбяднеў.

З дзевяці год Горкага таксама пасылаюць выбівацца „ў людзі". Спачатку ён служыць хлопчыкам пры магазыне абутку, потым вучнем чарцёжніка, дзе ён замяняў і дворніка, і няньку, і пакаёўку.

Але і ў гэтых умовах Горкі прабіў сабе шлях да кнігі і ўзьнікшае жаданьне чытаць прынесла яму шмат прыемнага і шмат крыўднага: у хаце мяшчан чытаньне кніг праследвалася, як шкодны занятак.

Потым Горкі служыць на параходзе поварам, прыказчыкам у іконным магазыне, вучнем у іконапіснай майстэрні, статыстам у кірмашным тэатры.

Ён парашыў з Ніжняга пераехаць у Казань, патаемна спадзяючыся прабіць сабе шлях да навукі. Ён марыў аб казанскім унівэрсытэце.

Пасьля прыезду ў Казань выявілася, што аб унівэрсытэце няма чаго і думаць. Зноў пачаліся пошукі сродкаў да існаваньня. Горкі працуе на прыстанях пільшчыкам і грузчыкам і жыве з „басякамі", людзьмі, якія зацікавілі яго сваімі варожымі адносінамі да мяшчанства, гандлярскага быту і бястурботнымі адносінамі да ўласнага жыцьця.

У Казані-ж ён сустрэўся і з новым для яго асяродзішчам—з радыкальна настроенай казанскай моладзьдзю, галоўным чынам студэнтамі. Горкі прысутнічае на іх бурных зборышчах і дрэнна разумее іх спрэчкі; але ён разумеў адно: ёсьць людзі, якія рыхтуюцца перамяніць жыцьцё на лепшае.

Перамяніць жыцьцё на лепшае—да гэтага Горкі хацеў прыступіць адразу-ж. Папаўшы на работу ў кандытэрскую, з жудаснымі ўмовамі жыцьця, ён прабаваў скарыстаць абурэньне рабочых і арганізаваць нешта падобнае да забастоўкі.

Кінуўшы булачную, Горкі зноў бадзяецца, пераходзячы з месца на месца, зноў працуе грузчыкам, служыць садоўнікам і дворнікам, паступае ў харысты. Адарванасьць ад людзей, адзіноцтва, заблытанасьць жыцьця даводзіць юнака Горкага да спробы пакончыць жыцьцё самагубствам. На шчасьце стрэл у грудзі быў не сьмяротным, і Горкі ачуняў „на доўгае і ўпартае жыцьцё". Ён едзе на рыбную лоўлю на Касьпі, служыць начным вартаўніком і вагаўшчыком на чыгункі.

У 1891 і 1892 гг. ён абышоў Паволжа, Дон, Украіну, Бэсарабію, Крым і Каўказ, атрымаўшы вялізарны запас уражаньняў і невычарпальны матар'ял для сваіх будучых апавяданьняў.

Застаўшыся жыць у Тыфлісе і паступіўшы на работу ў чыгуначныя майстэрні, Горкі сходзіцца з блізкім яму колам рабочай моладзі і разам з некалькімі таварышамі арганізуе прапагандысцкі гурток, якія наведваюць рабочыя-чыгуначнікі.

У Тыфлісе-ж Горкі напісаў сваё першае апавяданьне „Макар Чудра".

Вярнуўшыся ў Ніжні і працуючы ў адваката, Горкі зьмяшчае ў мясцовых газэтах рад апавяданьняў. На адно з апавяданьняў зьвярнуў увагу пісьменьнік Караленка, жыўшы ў гэты час у Ніжнім. Ён стаў уважлівым кіраўніком маладога пісьменьніка на першых кроках яго дзейнасьці. Ён-жа надрукаваў у часопісі „Русское богатство" першае вялікае апавяданьне Горкага „Челкаш", і з гэтага часу Горкі становіцца вядомым у шырокіх колах чытачоў.

Сьледам за першымі рамантычнымі апавяданьнямі—„Макар Чудра", легэндай аб людзях, якія аддалі перавагу сьмерці нявольніцтву, „Песни о соколе", услаўляючай „безумство храбрых", „Старухай Изергиль" пасьледавалі і рэалістычныя апавяданьні „Бывшие люди", „Скуки ради", „Кирилка" і інш., у якіх аналізуецца клясавая грамадзкасьць з яе эксплёататарскай істотнасьцю. А апавяданьні „Варенька Алесава", Озорники", „О чорте", „Еще о чорте" сатырычна білі па лібэральнай інтэлігенцыі, раздвоенай у сваіх жаданьнях, нездольнай і бездапаможнай. Усе гэтыя апавяданьні адыгралі вялікую ролю ў гісторыі рэвалюцыйнага ўздыму 90-х гадоў, дапамагаючы рэвалюцыйным элемэнтам грамадзкасьці паўней разгледзець клясавага ворага і заклікаючы да барацьбы за зьмену жыцьця.

Шырокая папулярнасьць Горкага ў асяродзішчы рабочых і рэвалюцыйнай моладзі вымушала царскі ўрад шукаць мэтадаў „абясшкодзіць" яго. У 1901 годзе Горкага арыштавалі і выслалі ў павятовы гарадок Арзамас для таго, каб аддаліць яго ад фабрычна-заводзкіх цэнтраў. Гэта ня перапыніла, вядома, сувязі Горкага з партыйнымі арганізацыямі, і ў 1902 г. вярнуўшыся са ссылкі, ён арганізавана зьвязваецца з рэвалюцыйнай сацыял-дэмакратыяй, з яе кіруючай Ул. Іл. Леніным газэтай „Искра". Праз год гэта частка сацыял-дэмакратыі арганізавала партыю бальшавікоў, і Горкі цесна ўваходзіць у кола яе работы. У бурныя дні 1905 году Горкі зьяўляецца адным з арганізатараў газэты „Новае жыцьцё", якая становіцца першым легальным органам бальшавікоў і фактычна рэдагуецца Ў. І. Леніным.

Горкі прымае ўдзел і ў арганізацыі маскоўскага сьнежаньскага паўстаньня, дапамагаючы ўзбраеньню рэвалюцыі і разгортваньню баявых паходаў. У пачатку 1906 году партыя даручае яму паездку ў Амэрыку для збору грошай у дапамогу рэвалюцыі. За час гэтай агітацыйнай паездкі Горкі напісаў „Мать", адзін з вялізарнейшых сваіх твораў. Вядома, як ацаніў Ленін зьяўленьне твору „Мать", якое значэньне мела гэта аповесьць для расійскага і заходня-эўрапэйскага пралетарыяту. На захадзе яна распаўсюджвалася прыкладаньнем да рабочых газэт у мільённых экзэмплярах. Больш няўдачлівым быў рускі рабочы-чытач. Царскі ўрад па-свойму ацаніў „Мать". Ён канфіскаваў першы зборнік, у якім зьявіўся пачатак аповесьці, вырваў з другіх вялізарныя кавалкі і не дапусьціў асобнага выданьня. Таму „Мать" у Расіі зьявілася толькі пасьля рэвалюцыі 1917 году. Наступленьне рэакцыі біла па другіх творах Горкага. Рад апавяданьняў яго зусім не маглі друкавацца ў Расіі: „9-го января", „Патруль", „З аповесьці", „Русский царь". П'еса „Враги" была надрукавана і „забаронена да прадстаўленьня на сцэне". Па тэй-жа прычыне не магла зьявіцца п'еса „Последния", а з вялікай аповесьці „Жизнь ненужного человека", маляваўшай жыцьцё і дзейнасьць органаў абароны, дапушчан быў да друку толькі пачатак. З наступленьнем рэакцыі Горкі пераходзіць на становішча палітычнага эмігранта і, пасяліўшыся ў Італіі, працягвае работу над новымі творамі.

У 1909-10 гг. былі надрукаваны „Городок Окуров" з „Жизни Матвея Кожемякина", надзвычайныя аповесьці аб мяшчанскім быце. З таго часу акураўшчына становіцца вызначэньнем гэтай тупой, коснай сілы, якая скоўвала старую Расію.

Калі пасьля аслабленьня рэакцыі бальшавіком удалося паставіць зноў легальную газэту „Звезда", Горкі зьмясьціў у ёй некалькі казак, Ленін піша яму ў 12 годзе: „Надзвычайныя казкі, якімі вы шмат дапамагалі „Звезде", і гэта мяне радавала надзвычайна"...

З 1913 году Горкі рэдагуе літаратурны аддзел бальшавіцкай часопісі „Просвещение" і ў гэтым-жа годзе пачынае свой жыцьцяпіс „Детство", „В людях" і „Мои университеты".

„Дело Артамоновых", якое зьявілася ўжо пасьля рэвалюцыі, напісана ўжо на зьмест іншага парадку. Гэта—гісторыя капіталістычнага роду Артамонавых, справа якіх разбураецца па меры разьвіцьця і росту рабочай клясы. Гэты працэс аж да рэвалюцыі, якая начыста зьмяла справу Артамонавых, справу капіталізму, паказан Горкім з надзвычайным аналізам. На апошнія гады падае яшчэ ня скончаная работа над аповесьцю „Жизнь Клима Самгина". Гэта вынік інтэлектуальнага і спэцыяльнага жыцьця Расіі апошніх дзесяцігодзьдзяў. Гэта палемічная справа вялікай сатырычнай вострасьці.

За гады Савецкай улады Горкі надрукаваў вялізарную колькасьць артыкулаў, у якіх выступае ў абарону першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы, выкрываючы яе паклёпнікаў, прапагандуе вялізарныя дасягненьні савецкай улады.

(„Правда").

ПАЎЛЮК МАРЧАНКА

Героі дзён

(*Нарыс*)

Дзьверы складу шырока расчынены. Сартавальшчыкі сумуюць бяз справы, паглядваюць то ў адзін канец вуліцы, то ў другі. На складзе ўсяго некалькі цэнтнэраў валакна. Хтосьці едка заўважвае:

— Калгасам і да зімы ільну ня здаць...

Але не дагаварыў.

— Вязуць!

На вуліцу завярнулі ўвязаныя вяроўкамі вазы.

— Адкуль?

— Антонаўскага сельсавету

— Якая вёска?

— Калгас „Новае жыцьцё".

— Заяжджайце, заяжджайце вось сюды...

Сьветлыя кулькі захадзілі па руках прыёмшчыкаў. Глядзелі, ацэньвалі якасьць валакна.

— Глядзі, не глядзі, ён у нас увесь аднолькавы.

— Які нумар?

— Чатырнаццатага 350 *кг.*

— Дванаццатага 342.

— Увесь прывезьлі, ці яшчэ ёсьць?

— Ды ў нас яго сёлета 43 *га.* У мінулым годзе было толькі 19 *га.*

Прысутныя калгасьнікі гутарылі пра калгасныя справы. Знайшліся і такія, якія даводзілі непатрэбнасьць засеву ільну. „Навошта ён нам, толькі працы з ім не абабрацца. Лепш-бы жыта пасеялі". „Эт ты стары. Цябе твае гады назад цягнуць. Хлеб за лён атрымаем, а лён фабрыкам аддамо",—гуртам адказала група калгасьнікаў на такія разважаньні.

Далей успаміналі, колькі хлеба за лён атрымалі ў мінулым і падлічвалі даходы калгасу ў гэтым годзе.

* * *

Расьсейваецца цемра ночы. Зьлева вымалёўваюцца вяршаліны лесу, справа—хаты і пуні калгасьнікаў.

Праз шчыліны сьцен гумна відно сьвятло лямпы. Трашчыць высушаная траста ў вострых зубцах мялкі. Круціцца пыл, ляціць ва ўсе бокі кастрыца.

Калі старшыня калгасу **Марына Чубава** ўвайшла ў гумно, адзін з мяльшчыкаў, спацелы і запылены, ускінуў свае чорныя як восеньская ноч бровы і весела крыкнуў:

— З поўначы мнем. Палову гумна заклалі.

Вечарам у канцылярыю калгасу прыходзіў малады гультаяваты хлапец Зосімаў Андрэй. Ён прышоў скардзіцца старшыні, што ў яго няма газы для працы ўночы. Калі яму далі газы, ён усё роўна не супакойваўся.

— У мяне лямпы няма.

Стала зразумелым, што прычына ня ў лямпе і газе, а ў тым, што не падабалася Зосімаву праца ў тры зьмены. Не хацелася яму працаваць уночы. А гаварыць аб гэтым адкрыта было сорамна, бо ўсе калгасьнікі на сходзе самі прынялі гэты парадак, які ўжо на справе даў добрыя вынікі. Таму і пусьціўся Зосімаў на хітрыкі. Але не ўдаліся яны. Гаспадарнік Міхаленка



Расьцілка ільну.

і працуючыя на ільне калгасьнікі моцна трымаліся за ўстаноўлены парадак, бо абавязацельствы—**здаць да 1-га кастрычніка ўвесь лён пераапрацаваным—хацелі выканаць з гонарам.**

— Ат пасьпееце,—заяўляў Зосімаў.

— Ня толькі пасьпеем, але і раней тэрміну справімся, калі з газай перабою ня будзе.

Гэта ня пустыя словы. Яны пацьвярджаліся справаю. Кожны дзень у калгаснай пуні прыбаўлялася пяць цэнтнэраў чыста апрацаванага валакна.

* * *

Раней былыя хутарскія гаспадаркі былі разьдзелены шырокімі межамі, якія зарасталі розным зельлем. Шмат было закінутых кавалкаў зямлі. Але калгас прыпыніў засільле зельля. Злучылі шнуры ўчарайшых аднаасобнікаў у чорныя вялікія і моцныя глыбы зяблівa.

Зьнікла лазовая зарасьль, адсунулася к лесу. Тут вялася ўпартая барацьба за зямлю.

Старшыня Марына Чубава акінула поглядам далёка раскінутыя палі калгасу і задаволена ўсьміхалася. Яна ўжо зараз на

Прасушваньне ільну.

месцы гэтага зааранага поля бачыла мора каласістай буйнай пшаніцы.

„Гэта яшчэ ня ўсё“...—Думала яна.

Калгас „Новае жыцьцё“ апраўдвае сваю назву. Тут сапраўды будуецца новае жыцьцё. Ня толькі словы новыя, як: ударнік, сацспаборніцтва і інш., але праца зусім новая і адносіны да працы не падобныя да ранейшых. На сходах у гутарках словы „наша поле“, „наш лён“, „наша гаспадарка“—даўно пабілі і заглушылі разуменьне „маё“. І калгасьнікі на справе ўдарнай працай даказваюць гэта.

Матруна **Кончыкава**, Ганна **Авар'янава** і шмат іншых могуць служыць лепшымі прыкладамі, як трэба працаваць. Яны сапраўдныя ўдарніцы. Нормы заўсёды перавыконваюць. **Замест 200 вязанак абмалачвалі 350—400.**

Яны ня толькі самі добра працуюць, але і другіх падштурхоўваюць падцягвацца.

— Ну чаго сталі. Абавязацельства ня выканаем. Сорам вялікі будзе.

Ударнікі самі прыстасоўваюць нормы райкалгассаюзу да сваіх умоў. Замест 8 кілё на трапальшчыцу—нормы райкалгассаюзу—10 кілё,—сказалі ўдарнікі-калгасьнікі і запісалі.

— Я колькі хочаш атраплю, а ну, давай навыперадкі,—сьмяецца Матруна **Кончыкава**. Сьмех ператвараецца ў справу. Ледзь толькі першыя праменьні сонца абымаюць бязьмежныя палі, выходзіць Матруна на працу і да вечара натрапвае 20-21 кілёграм.

* * *

Сьвет пяцілінейнай лямпы выцягваецца ў вузенькую палосачку, капціць і тухне. На стол прыносяць трохлінейку і пасяджэньне працягваецца. Відны толькі чалавечыя сілуэты. Коратка і цьвёрда кідае словы старшыня калгасу **Марына Чубава**.

— Абавязацельства, данае намі



Цераблень не ільну.

па здачы ільну дзяржаве, трэба выканаць. Вось вы, члены праўленьня, павінны растлумачваць гэта на ўсіх працах.

Гаварыць многа яна ня прывыкла, больш даводзіць справай, чым словамі. Недарма ў яе на грудзёх гарыць ордэн Чырвонага сьцягу, здабыты ў крывавай бойцы з Булак-Булаховічам. Гаворыць яна толькі аб справе і дужа коратка. Яна ведае ў гаспадарцы кожную драбніцу, ведае, калі, што і на працягу якога часу можна зрабіць. Яна занята гаспадаркай круглыя суткі. Усё жыцьцё яе ў гэтай гаспадарцы. Раніцой на сьвітаньні і цёмным вечарам яе спаткаеш за кніжкамі канцылярыі, у гумне, у сьвірне. Адпачні крыху—казалі калгасьнікі.

— Я лепш адпачываю ў працы—адказвала **Чубава**.

— І што за жанчына, нібы сталёвая. Нават адпачыць не жадае,— разважаў дзед Улас,— колькі жыву, такіх ня бачыў.

Вось каб такія ўсе былі, то сацыялізму хутка-б правялі-б,— перабіўшы дзеда, прагаварыў другі.

— Правядзем, дзядзька. Трэба толькі працаваць сумленна, каб праца пайшла на карысьць, а з гультаямі сацыялізму не пабудуеш— гаварыла Марына. Дзед Улас увесь час з цікавасьцю слухаў яе словы і потым сам стаў гаварыць.

— Праўда, унучка, усё праўда. Я стары, але ўсёй сваёй душой веру, што ўсё праўда. І дзед на апошніх словах заківаў сваёй сівенькай кароценькай бародой.

Чубава сьпяшалася ў сельсавет на нараду і гутарыць ёй ня было часу. Яна палажыла канцылярскія кніжкі і, папрасіўшы прабачэньня, што ня можа з імі далей гутарыць, вышла з праўленьня калгасу.

— Во жанчына,—агонь.

Гутарка вялася доўга. Гаварылі ціха, з расстаноўкамі.

— У такой гаспадарцы душа вяселіцца. І Малашонкаў доўга пералічвае працы палявода; дзе патрэбна канаўку для стоку вады пракапаць, дзе балота асушыць, дзе лазу высеч.

— Трэба так зрабіць, каб ні аднаго кавалка зямлі не пуставала.

І без канца цягнуліся размовы. Кожны даваў парады, што як лепш зрабіць, выкрывалі недахопы.

Ламаецца старая вёска, шырацца ўраджайныя сацыялістычныя палі. Зьмяняецца чалавек, выбіраючыся з вясковага прадоньня багны, нуды і бяскультур'я. Нараджаюцца новыя людзі. Шырыцца перад імі шырокі шлях... Шлях да сьветлай будучыні.

Чавусы, калгас „Новае жыцьцё“.

Калгасьніцы, сваячасовай здачай (продажам) ільну дзяржаве — забясьпечым выкананьне плянаў ільназагатовак

Ні аднэй бульбіны не пакінуць у зямлі

Бульба зьяўляецца аднэй з вядучых культур у сельскай гаспадарцы БССР. Аб гэтым красамоўна гавораць лічбы. Калі ў 1916 годзе бульбы было засеяна 212,2 тысячы га, у 1924 годзе—321,6 тысяч га, то ў 1932 годзе мы маем 610 тысяч га. Як бачым, засеў бульбы з году ў год павялічваецца. 610 тысяч га—гэта не малая колькасьць пры нашых ураджаях—гэта каля 7 мільёнаў тон бульбы.

Асноўная задача, якая зараз стаіць перад калгасамі і саўгасамі—гэту колькасьць **бульбы ўбраць і галоўнае, убрадь бяз страт.**

Кожная работніца саўгасу і калгасьніца павінна ведаць, што **галоўнае пры ўборцы бульбы гэта барацьба са стратамі.**

Трэба добра ўлічыць вопыт уборкі мінулых год і не дапусьціць паўтарэньня памылак. У мінулым годзе з-за позьняга капаньня і дрэннага захаваньня страты былі вельмі вялікія. Было пакінута на полі і пагніло ў капцох 40 проц. усёй бульбы. Ні ў якім разе нельга дапусьціць такіх страт у гэтым годзе. У гэтым годзе ў параўнаньні з мінулым капаньне бульбы распачалося сваячасова, але да гэтага часу яно разгортваецца досыць марудна. На 25-IX убрана толькі 22,3 проц, усяго засеву. Апошні тэрмін уборкі —5 кастрычніка. І ўжо зараз відавочна, што рад раёнаў, якія зараз адстаюць ва ўборцы, як Асьвейскі, Вушацкі, Сіроцінскі, Расонскі, Полацкі і інш., у тэрмін ня справяцца з уборкай.

Адсюль задача кожнай работніцы і калгасьніцы і кожнай саўгасьніцы—падвоіць і патроіць тэмпы ўборкі бульбы. Тут рашаючую ролю адыгрывае вытворчая пастаянная брыгада.

Трэба разгарнуць масавую працу ў брыгадзе, арганізаваць сацспаборніцтва паміж паасобнымі брыгадамі на сваячасовую і добраякасную ўборку, на датэрміновае выкананьне і перавыкананьне брыгадных заданьняў.

Асабліва адстаюць ва ўборцы прыгарадныя гаспадаркі. Прафарганізацыі гораду яшчэ як сьлед не павярнуліся тварам да сваіх прыгарадных гаспадарак. Тут вялікая задача стаіць перад самімі работніцамі, перад дэлегацкімі сходамі. Трэба неадкладна наладзіць дапамогу ва ўборцы бульбы і гародніны прыгарадным гаспадаркам.

Дэлегаткі фабрык і заводаў павінны быць застрэльшчыкамі гэтай справы.

Трэба добра растлумачыць кожнай работніцы і кожнай калгасьніцы, што ад добраякаснай уборкі залежыць кошт працадня калгасьніцы, забесьпячэньне рабочых гораду і забесьпячэньне сырцом нашай прамысловасьці, што добраякасная ўборка забясьпечыць кармамі нашы СТФ, МТФ і жывёлу, якая знаходзіцца ў аднаасобным карыстаньні.

Мала бульбу выкапаць з зямлі, яе трэба добра захаваць. Хаваньне—гэта такая-ж важная задача, як і сама ўборка. Асабліва трэба зьвярнуць увагу на добраякаснае хаваньне насеннай бульбы.

Пры капаньні бульба тут-жа на полі павінна сартавацца. Ні ў якім разе ня трэба дапускаць ссыпаньня бульбы ў капцы, паграбы і іншыя бульбахавальнікі неперабранай і непрасушанай.

Адна гнілая бульбіна, папаўшая ў капец, можа сапсаваць усю захаваную бульбу. Таму асаблівая ўвага пры ўборцы павінна быць зьвернута на сартаваньне бульбы і яе захаваньне.

Памяшканьні для хаваньня бульбы павінны быць загадзя прыведзены ў парадак, вычышчаны, праверaны. На арганізацыю справы захаваньня павінны быць вылучаны людзі вопытныя, знаёмыя з гэтай справай. І тут сталая вытворчая брыгада павінна адыграць сваю ролю. Брыгада павінна адказваць ня толькі за добраякасную ўборку вызначанага ёй вучастку, але і за вядомую колькасьць захаваньня бульбы.

Кожны калгас, кожны саўгас павінен арганізаваць пераворваньне бульбянога поля пасьля капаньня, каб ні аднэй бульбіны ў зямлі не пакінуць.

Трэба на мясцох рашуча змагацца з настроямі чарговасьці работ, ёсьць разважаньні такія, што, калі адсеемся, тады прымемся за захаваньне бульбы. Такое разважаньне шкоднае і няправільнае. Трэба так расставіць рабочую сілу, каб сяўбу канчаць, і бульбу капаць, і бульбахавальнікі рыхтаваць і рабіць іншыя патрэбныя ў даны момант сельска-гаспадарчыя работы. Гэта выключна залежыць ад правільнай расстаноўкі рабочай сілы ў самім калгасе, ад правільнага і поўнага скарыстаньня машын, інвэнтару і цягавай сілы.

Значная частка рабочай сілы, якая занята па ўборцы бульбы, зьяўляюцца жанчыны. І таму дэлегацкія сходы і агульныя сходы жанчын павінны падрабязна абгаварыць пытаньне ўборкі і хаваньня бульбы.

Лепшым паказальнікам правільнай барацьбы за ўраджай бульбы будзе служыць сваячасовае выкананьне абавязкаў перад дзяржавай.

У гэтым годзе плян па бульбе значна зьменшаны ў параўнаньні з мінулым годам. Калі па пляну мінулага году трэба было здаць (прадаць) дзяржаве 750 тысяч тон, дык у гэтым годзе—420 тысяч тон. Гэта памяншэньне пляну зроблена для таго, каб даць магчымасьць калгасам і працоўным аднаасобнікам пасьля выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай шырока разгарнуць савецкі гандаль бульбай.

Да 25 жніўня пляны загатовак бульбы павінны быць даведзены да вёсак і калгасаў. **Кожная калгасьніца і працоўная аднаасобніца павінна ведаць плян загатовак свайго калгасу, сваёй вёскі і актыўна дапамагаць яго выкананьню.**

Кожны дэлегацкі сход павінен абгаварыць пытаньне загатовак бульбы і практычна дапамагчы сельсавету ў яго выкананьні шляхам растлумачальнай работы сярод мас працоўных жанчын. **В. Р.**



Чырвоны абоз калгасьнікаў. Слуцкага раёну.

Работніцы дапамагаюць прыгарадным гаспадаркам ва ўборцы бульбы і гародніны

Работніцы паказваюць узоры працы ў прыгараднай фэрме

Пасьпяхова разгортваецца ўборачная кампанія ў прыгараднай фэрме фабрыкі „Пралетарская перамога“ (Барысаў). Праведзеная масавая работа вакол удзелу работніц ва ўборцы бульбы і гародніны дала свае вынікі.

Работніцы паказваюць узоры працы ня толькі ва ўборцы. Ня менш актыўна яны працавалі ў часе пасеўнай і праполачнай. Кожны дзень можна заўважыць на фэрме работніц, якія сапраўды па-бальшавіцку змагаюцца за посьпех уборачнай.

З боку фабкому забясьпечана кіраўніцтва гэтай работай. **Спэцыяльны працаўнік фабкому тав. Каралёнак займаецца выключна пытаньнем работы на прыгараднай гаспадарцы.** Праводзіцца вялікая папярэдняя масавая работа з работніцамі перад выхадам іх у поле. На нарадах старшынь цэхкамітэтаў падрабязна абгаварваецца пытаньне аб значэньні і неабходнасьці дапамогі работніц прыгараднай гаспадарцы. Разыходзячыся ў цэхі, старшыні цэхкамітэтаў праводзяць вялікую растлумачальную работу сярод работніц вакол гэтага пытаньня.

Выхад работніц на працу робіцца плянава. За гэта адказвае тав. **Каралёнак.** За адпрацаваныя дні на фэрме работніцы атрымліваюць натурай: агуркі, бульбу, памідоры. У дзень зарабляюць 15—16 кг бульбы. Таксама аплачваюцца працадні, выпрацаваныя пры пасеўнай і праполачнай кампаніі.

Брыгада тав. **Левінай Бэрты** (старшыні цэхавага камітэту) — адна з лепшых. Маючы кантрольнае заданьне ў 600 працадзён, брыгада выпрацавала ўжо 362 працадні. Брыгада Левінай Х., маючы кантрольнае заданьне ў 500 працадзён, ужо выпрацавала—327 працадзён. Пры далейшай мабілізацыі мас работніц, уборка ў прыгараднай фэрме бязумоўна будзе скончана ў тэрмін.

Вопыт плянавай, ударнай і сыстэматычнай дапамогі работніц ф-кі „Пралетарская Перамога“ сваёй прыгараднай гаспадарцы неабходна перанесьці на іншыя прадпрыемствы.

К.

ТАКІХ, ЯК ГАННА, МНОГА

(Калгас Чырвоны „Барацьбіт“, Слуцкага раёну)

Цёмная сьцяна кучаравых ліп хавала вёску Вынісцы ад вачэй праходжых, а на канцы вёскі, абстаўлены з усіх бакоў дрэвамі, як сьведка мінулага, прытуліўся касьцёл.

Гэта ён—сейбіт цемры і забабонаў, рассаднік контррэвалюцыі ў саюзе з клясавым ворагам — кулаком, вышчарыўшы зубы, шалеючы ад злосьці, стаяў на шляху, каб загарадзіць подступ да новай калектыўнай сыстэмы.

Сарвацы Разваліцы Не дапусьціць арганізавацца.—Шыпелі ворагі.

Ня лёгка было зламаць трудасьці на шляху пабудовы калектыўнай гаспадаркі. Трэба было перамагчы кулака і ксяндза.

— Возьмем, хлопцы, — сказаў сакратар першамайскай партячэйкі тав. Тарасэвіч.

І ўзялі.

Больш Вынісцаў няма. Засталіся тыя-ж ліпы, тыя-ж хаты. Але ўжо ня вёска, а нацыянальна-польскі калгас „Чырвоны барацьбіт“.

І тады, калі частка беднякоў і сераднякоў станавілася на новы шлях гаспадараньня, удава **Дробыш** Ганна была ў першых радох. Яна не пабаялася кулацкай плёткі, што „ў калгасе галадаюць“. Пашла і працавала па-ўдарнаму.

У гэтым годзе калгас „Чырвоны барацьбіт“ сабраў добры ўраджай. Авансы выдавалі па прынцыпу „хто больш выпрацаваў, той больш і атрымае, хто не працаваў той нічога не атрымлівае“. У Ганны-ж колькасьць працадзён 295, а канец году яшчэ далёка.

Паводле папярэдніх падлікаў, аднаго жыта Ганне **Дробыш** прыходзіцца 63 пуды і 30 фунтаў, пшаніцы—4 пуды, аўса—28 пуд., ячменю—36 пуд., бульбы—380 п. і 312 пуд. сена, ды 3 пуды круп.

Ганна кажа:—Будучы на сваёй гаспадарцы, столькі я-б ніколі не атрымала.

Дробыш атрымала столькі таму, што добрасумленна адносілася да працы.

Зусім на тое атрымаў калгасьнік **Шкурскі Кастусь.** Удваіх выпрацавалі толькі 90 працадзён.

Паказальнікі разьмеркаваньня ўраджаю калгасу „Чырвоны барацьбіт“—сапраўды рэкордныя. Гэта прыклад — адзін з многіх. Такіх, як Ганна, многа, безьліч у калгасах. Яны перамагаюць, заваёўваюць пяршынства.

Раўненьне па іх!

Я. Траяноўскі.

Работніцы чыгуначнай бальніцы дапамагаюць прыгараднай гаспадарцы ТПО ва ўборцы гародніны

Сустрэць 15 гадавіну Кастрычніка ПЕРАМОГАЙ У ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКАХ

Сярод важнейшых сельскагаспадарчых кампаній, асабліва вялікае значэньне маюць збожжазагатоўкі. Ад поўнага і сваячасовага выкананьня пляну загатовак збожжа залежыць снабжэньне гарадоў і Чырвонай арміі. Малейшыя перабоі ў забесьпячэньні гарадоў збожжам адбіваюцца на рабоце прамысловасьці, на выкананьні прамфінпляну.

Кожная калгасьніца, бяднячка і сераднячка-аднаасобніца павінна ведаць, што кожны лішні пуд ураджаю з гэктару, кожны лішні пуд загатоўленага збожжа дапамагаюць павялічэньню вырабу новых трактараў, камбайнаў, плугоў, тавараў шырокага спажыванья, дапамагаюць будаўніцтву новых заводаў. Кожны лішні пуд збожжа — гэта новы ўдар па клясаваму ворагу, па кулаку—гэта замацаваньне заваяваньняў Кастрычніцкай рэвалюцыі. Так стаіць пытаньне.

У сваю чаргу кожны нявыкананы процант пляну б'е па снабжэньні гарадоў, выклікае пагаршэньне работы прамысловасьці і тым самым адбіваецца на забесьпячэньні вёскі машынамі, трактарамі, прамтаварамі. Вы бачыце, якая цесная сувязь паміж збожжазагатоўкамі, паляпшэньнем дабрабыту шырокіх мас вёскі і ўзмацненьнем калгаснай гаспадаркі.

Вось чаму выкананьне пляну збожжазагатовак—першачарговы абавязак кожнага калгасьніка, бедняка і серадняка-аднаасобніка.

Збожжазагатоўкі ў гэтым годзе праходзяць у асабліва спрыяючых умовах. Трэцяя бальшавіцкая вясна дала поўную перамогу сацыялістычнаму сэктару, які па СССР ахапіў 4/5 усёй яравой плошчы. Па БССР пасеўны плян выканан з павялічэньнем супроць мінулага году больш чым на 9 проц. Значна ўзьнялася ўраджайнасьць калгасных палёў. Гэтыя перамогі зьяўляюцца лепшым паказальнікам правільнасьці генэральнай лініі партыі. Яны ствараюць магутную базу для выкананьня пяцігодкі ў чатыры гады. Яны даюць поўную магчымасьць сваячасова выканаць плян збожжазагатовак і шырока разгарнуць калгасны гандаль.

Ідучы насустрач інтарэсам шырокіх працоўных мас вёскі, ставячы сваёй задачай узьняцьце дабрабыту калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў, партыя і ўрад 6-га мая пастанавілі зьменшыць плян збожжазагатовак па вёсцы і разгарнуць калгасны гандаль збожжам.

Па БССР плян зьменшан з 6 да 4 мільёнаў пудоў збожжа. На два мільёны менш, чым летась! Ёсьць раёны, дзе плян зьменшан больш чым на палову.

Партыя патрабавала зьнішчэньня ўраўнілаўкі ў складаньні плянаў. Калгас, які лепш працуе, дабіўся большага ўраджаю, лепш убраў яго — павінен атрымаць у сваё распараджэньне больш збожжа.

Усе ўмовы гэтага году даюць поўную магчымасьць пераможна скончыць кампанію збожжазагатовак.

Дзесяткі калгасаў, сотні бядняцка-серадняцкіх гаспадарак адказалі на пастанову партыі і ўраду датэрміновай здачай збожжа. Калгасы **Жыткавіцкага і Дзяржынскага** раёнаў ужо здалі ўсё збожжа, што трэба было загатовіць паводле гадавога пляну. Аднаасобнікі **Жартайскага** сельсавету—Барысаўскага раёну, **Азарыцка-Слабодзкага** сельсавету — Смалявіцкага раёну, **Цяплінскага** сельсавету—Вузьдзенскага раёну скончылі здачу збожжа. Гэтыя перадавікі загатовак добра зразумелі, што, выконваючы плян раней тэрміну, яны гэтым на справе дапамагаюць ажыцьцяўленьню пяцігодкі за чатыры гады, дапамагаюць будаўніцтву сацыялізму.

Аднак, гэта зразумелі далёка ня ўсе. Збожжазагатоўчы плян па БССР выконваецца нездавальняюча. Да 25 верасьня выканана толькі 24,1 гадавога заданьня, у той час як да 1-га кастрычніка павінна быць загатоўлена 45 проц. Ёсьць раёны, напрыклад, Чавускі, Сененскі, дзе загатоўлена 5—7 проц. пляну.

Чаму гэта так? Справа ў тым, што загатоўкі трэба па-бальшавіцку арганізаваць.

Збожжазагатоўкі ў гэтым годзе праходзяць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Рэшткі кулацтва ўсімі сіламі імкнуцца сарваць кампанію. Яны ня толькі хаваюць сваё збожжа, здаюць жыта, зьмешанае з пяском, нават са шклом, прадаюць на рынку па спэкуляцыйных цэнах. Яны ўгаварваюць несьвядомых калгасьнікаў, беднякоў і серадняком не здаваць збожжа, везьці яго лепш на рынак. Праз сваіх агентаў—апартуністаў у некаторых праўленьнях калгасаў і сельсаветах, клясавы вораг імкнецца раскрасьці грамадзкае дабро, зацягнуць абмалот, разьмеркаваць збожжа па едакох, захаваць яго ў сьвірнах.

Ёсьць калгасьнікі і аднаасобнікі, якія паддаюцца на вудачку кулака. Яны на справе дапамагаюць кулаку сарваць загатоўкі і гэтым пагоршыць снабжэньне гарадоў і прамысловасьці. Яны прывозяць збожжа на рынак і прадаюць яго перакупшчыку; гэтым яны дапамагаюць спэкулянту нажыцца за кошт працоўных.

Што павінна зрабіць перадавая калгасьніца, бяднячка і сераднячка? Яе абавязак — разьбіць кулацкія манэўры, дапамагчы сваёй парт'ячэйцы і сельсавету выканаць плян сваячасова, сваім асабістым прыкладам паказаць, як трэба выконваць свае абавязкі перад дзяржавай.

Калгасьніца і аднаасобніца—бяднячка і сераднячка павінны выкрываць спробы кулака—захаваць збожжа. Яны павінны актыўна працаваць у камісіях садзейнасьці загатоўкам, гэтым дапамагаць выкананьню плянаў.

Шмат ёсьць у нас актывістак—калгасьніц і аднаасобніц. Адна з іх **Варвара Чумакова**, з вёскі Капусьціна, Бабруйскага раёну, прэміявана за ўдарную работу па збожжазагатоўках. Другая — **Галена Мультан** з Азарыцка-Слабодзкага сельсавету, Смалявіцкага раёну першая перавыканала сваё заданьне. Іх прыкладу трэба сьледаваць.

Актывісткі—калгасьніцы і аднаасобніцы павінны растлумачыць усім, што да 15 студзеня нельга вывазіць збожжа на рынак, што трэба сьпяшацца з выкананьнем пляну, каб потым разгортваць калгасны гандаль, бо плян зьменшаны і лішкі будуць вялікія.

Перадавыя калгасы выкінулі баявы лёзунг — **да XV гадавіны Кастрычніка прысьці з перамогай у збожжазагатоўках. Гэты лёзунг павінен стаць сьцягам барацьбы кожнай перадавой калгасьніцы, бяднячкі і серадняцкі—аднаасобніцы.**

Б—ў.

Актыўна, з уздымам праходзяць канфэрэнцыі жанчын Шклоўшчыны

Канфэрэнцыя калгасьніц і працоўных аднаасобніц пры сельсаветах распачаліся неўзабаве пасьля раённага зьлёту актывістак-жанчын—членаў сельсаветаў, камітэтаў узаемадапамогі і працуючых у іншых савецкіх і грамадзкіх арганізацыях на вёсцы.

У раёне наогул адчуваецца значны зрух у жаночай рабоце, рад адказных работнікаў кінуты зараз на вёску ў якасьці дакладчыкаў па пытаньнях ажыўленьня дзейнасьці дэлегацкіх сходаў, арганізацыі працы сярод жанчын.

Вось некалькі характэрных штрыхоў з працы сельсавецкіх канфэрэнцый.

Мікіцінскі сельсавет... Вакол будынку — нязвычайнае ажыўленьне, рух. Каля 15 падвод згрупавалася ў перамешку. Гэта прыехалі дэлегаткі,—ад калгасаў і вёсак па 1 ад 5 жанчын. Ехалі па некалькі чалавек на падводзе, ехалі, нагадваючы вясельле. З песьнямі, з шумам, з весялосьцю.

На канфэрэнцыі абмяркоўваюцца пытаньні ўдзелу жанчын у сацыялістычным будаўніцтве, у чарговых палітычна-гаспадарчых кампаніях. Памяшканьне сельсавету ледзь умясьціла 100 сабраўшыхся дэлегатак.

Адна за аднэй выступаюць дэлегаткі... Расказваюць яны пра работу калгасаў, пра спробы клясавага ворага сарваць бальшавіцкую ўборку ўраджаю ў гэтым годзе.

У часе перапынку мясцовы настаўнік тав. Клішо абвяшчае сямі жанчынам, што яны выйгралі па пазыцы „3-га рашаючага". Тав. Клішо, аказваецца, запісваў №№ аблігацый пры распаўсюджаньні іх і сачыў за тыражамі.

Наяўна паказаная выгада пазыкі для саміх падпішчыкаў тут-жа, на сходзе, робіць значны ўплыў на дэлегатак і стымулюе далейшае распаўсюджаньне пазыкі...

Канфэрэнцыя праходзіць актыўна, з вялікім уздымам. Дакладчыку—старшыні райкалгассаюзу тав. Буйвалаву—задаюць больш 40 пытаньняў. Канфэрэнцыя намеціла канкрэтныя мерапрыемствы ў працы калгасаў на бліжэйшы адрэзак часу.

Канфэрэнцыя ў Славацкім сельсавеце прыняла канкрэтныя прапановы па далейшаму разгортваньню масавай працы сярод жанчын у калгасах, саўгасах і вёсках.

Канфэрэнцыі ў другіх с-саветах прайшлі ня менш актыўна.

У бліжэйшы час жансэктару РК трэба абавязкова наладзіць праверку выкананьня ўзятых на канфэрэнцыях абавязацельств.

Юр. Лявонны.

т. Генькіна—загадчыца МТФ калгасу „1-га мая" Магілеўскага раёну падпісалася на пазыку на 140 проц. месячнага заробку, ударніца фінфронту.

Плян здачы ільнавалакна выканаем у тэрмін

Дэлегаткі калгасу імя Варашылава сабраліся на сход, каб абгаварыць пытаньне апрацоўкі і здачы ільну.

Ня многа ільну засеяў калгас усяго 3 *га*. Лён быў добра дагледжан і сваячасова ўбраны. Зараз патрэбна яго апрацаваць і здаць 10 пуд. валакна дзяржаве.

Дэлегатка **Гурыновіч** падрабязна расказала як змагаліся калгасьніцы за догляд ільну. Яна прызывала калгасьніц таксама змагацца і за яго апрацоўку і сваячасовую здачу.

Чарнушэвіч Гэля падрабязна растлумачыла дэлегаткам значэньне сваячасовай здачы ільну дзяржаве. „Фабрыкі чакаюць ад нас ільну, мы павінны яго сваячасова даць".

Дэлегаткі аднагалосна ўхвалілі выканаць пляны загатовак ільну ў тэрмін. Абавязаліся быць прымернымі ў працы па апрацоўцы ільну.

Копыльскі раён.

В-ва.

Выканаць дырэктывы партыі

На Магілеўскую раённую канфэрэнцыю калгасьніц і аднаасобніц сабраліся замест 150 жанчын... 23 асобы. З 29 сельсаветаў, якія ёсьць у раёне, сваіх дэлегатак прыслалі толькі 7.

Прычына зрыву ў адсутнасьці падрыхтоўкі да канфэрэнцыі з боку райкалгассаюзу і РК КП(б)Б. Ніхто не адчуваў адказнасьці за канфэрэнцыю. Ня былі накіраваны ўпаўнаважаныя для правядзеньня жаночых канфэрэнцый па сельсаветах. Хоць амаль у кожнай вёсцы сядзяць партыйцы для правядзеньня розных кампаній, ім гэтай работы не даручылі.

Калгасьніцы, якія прыбылі на канфэрэнцыю скардзіліся, што ім коняй даваць не хацелі. Калі Афанасьева з калгасу „Чырвоны партызан", Вендраўскага сельсавету папрасіла ў брыгадзіра Гаўрыленкі каня, каб паехаць на канфэрэнцыю, ён сказаў: „Што вам там „бабам" у горадзе патрэбна, абойдзецца без вас". Толькі пасьля доўгіх размоў, ён даў каня, але такога дрэннага, што ўсё роўна прышлося пехатою ісьці.

Але чаму-ж праўленьне калгасу ня бачыць як брыгадзір Борусовіч так часта выдае добрых коняй заможніку—цьвёрдазаданьніку Пухоўскаму з Хрыпялатскага сельсавету на ўсялякія асабістыя яго патрэбы.

Раённым арганізацыям неабходна ўлічыць урокі гэтай канфэрэнцыі. Неабходна дабіцца выкананьня дырэктыў партыі аб разгортваньні масавай работы сярод працоўных жанчын.

Магілеў.

Грумбіна.

ГОСУДАРСТВЕННАЯ БИБЛИОТЕКА

Шырэй разгарнуць пабудову бытавых установ

Беларусь атрымала ў спадчыну ад царызму разбураную гарадзкую гаспадарку.

За гады пасьля рэвалюцыі мы зрабілі вельмі многа. Паасобныя гарады, якія былі ў выглядзе руін, мы цалкам адбудавалі. Успомнім хаця-б спадчыну панаваньня белапалякаў—абгарэлыя кварталы і вуліцы Барысава, Полацку, Менску і раду іншых гарадоў і мястэчак БССР. Рост гарадзкой гаспадаркі і ўпарадкаваньне ўсё-ж адстае ад нябывалых у гісторыі тэмпаў індустрыялізацыі краіны. Гэта падкрэсьліў чэрвенскі пленум ЦК УсеКП(б) у 1931 годзе, прапануючы ўзмацніць тэмпы разьвіцьця гарадзкой гаспадаркі і разам з гэтым упарадкаваньня.

Разьвіцьцё гарадзкой гаспадаркі Менску і ўпарадкаваньне яго за апошнія гады значна зрушылася ўперад. На сёнешні дзень сталіцу БССР не пазнаць. Рад новых дамоў, многа рабочых пасёлкаў: „Камінтэрн“, „Грушаўскі“, „1-га мая“, „Чырвоны чыгуначнік“ пабудаваны вакол новых прадпрыемстваў Менску.

Рад вуліц пакрыт удасканаленымі маставымі—клінкерам (Савецкая, Карла Маркса, Чырвонаармейская). Рад вуліц, якія ня мелі маставых, замошчаны булыжнікам. На вуліцах пасаджаны дзесяткі тысяч дрэў. Дзесяткі новых сквэраў разьбіты ў тых мясцох, дзе раней панаваў бруд і пустыры. Узяць хаця-б Ніжні рынак, дзе зараз раскінуты сквэр. Пабудован і будуецца парк культуры і адпачынку.

Губэрскі Менск царскага часу—калёнія вялікадзяржаўнага імпэрыялізму—меў адсталы гарадзкі транспарт—конку. Зараз Менск мае пяць трамвайных маршрутаў, якія яднаюць рабочыя ўскрайкі з цэнтрам. У другой пяцігодцы агульны працяг трамвайных ліній па Менску будзе праведзен да 70 кілёмэтраў.

Пытаньню бытавога вызваленьня працоўных жанчын партыя аддае выключную ўвагу. Ранейшы Менск ня ведаў, што такое ясьлі, дзіцячы сад, грамадзкая сталоўка, пральня. Толькі некаторыя дзеці багатых мелі магчымасьць навучацца музыцы, мовам у той час, як шмат пралетарскіх дзяцей валялася па дварох, на вуліцах, у пыле і брудзе.

Гэта было.

А зараз ясьлі даюць магчымасьць тысячам жанчын працаваць на вытворчасьці, быць ударніцамі, актыўна ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве.

У сацыялістычным сэктары вёскі Менскага раёну арганізаваны 102 дзіцячыя пляцоўкі, 67 дзіцячых садоў і колькасьць іх расьце з кожным годам. З ліку гарадзкіх ясьляй і дзіцячых садоў ёсьць добра абсталяваныя, у якіх работніцы могуць пакідаць сваіх дзяцей на пяць дзён (Фабрыка „Кастрычнік“, дзіцячыя ачагі—№ 7 і 8). Амаль кожнае прадпрыемства мае свае ясьлі, свой дзіцячы сад.

Такое-ж становішча і са сталоўкамі. Сотні рабочых сталовак вызваляюць работніцу ад хатняй гаспадаркі, ад прымусу і кухні.

Аднак, мы вымушаны сёньня з усёй рэзкасьцю паставіць пытаньне аб тым, што яшчэ ня ўсё зроблена па паляпшэньні быту рабочых. Толькі недаацэнкай важнасьці вызваленьня жанчын можна тлумачыць тое, што рад дамоў, пабудаваных па апошнім слове тэхнікі, шматкватэрных, пазбаўлены сваіх пральняў, ясьляй, дзіцячых садоў, сталовак.

Возьмем, напрыклад, 112-кватэрны дом для чыгуначнікаў. Там мы не знаходзім гэтых неабходных бытавых установ. Дом яшчэ ня скончан. Памылку можна выправіць на ходу.

У рабочых пасёлках „Камінтэрн“ і іншых няма клюбу, мала бытавых установ. Нашы арганізацыі яшчэ недаацэньваюць важнасьці бязумоўнага выкананьня дырэктыў партыі аб стварэньні ўмоў для ўцягненьня жанчых у прамысловасьць. Гэтыя задачы могуць быць вырашаны толькі шляхам пабудовы бытавых установ.

Мы павінны сёньня таксама сыгналізаваць аб дрэннай працы пральняў. У Менску ёсьць толькі адна мэханізаваная пральня. Але яна загружана заказамі ўстаноў і вайсковых часьцей і ў малой частцы абслугоўвае насельніцтва. Новая мэханізаваная пральня будуецца недапушчальна марудна. Пры жактах было арганізавана 15 пральняў, але ў выніку агідных адносін гаржылсаюзу, недаацэнкі іх работы яны ўсе не працуюць.

Мільённыя сродкі адпушчаюцца на паляпшэньне бытавых умоў працоўных. Работніцы нашых прадпрыемстваў павінны ўзяць пад неаслабны кантроль ход новага будаўніцтва, а таксама работу ўжо існуючых бытавых установ.

Трэба зламаць коснасьць і адсталыя погляды нашых будаўнічых арганізацый, якія пры новых буйных жыльлёвых і другіх пабудовах ня ўключаюць у аб'екты будаўніцтва бытавыя ўстановы. Мы павінны дабіцца, каб пры кожным шматкватэрным доме былі найбольш неабходныя бытавыя ўстановы. Пытаньні паляпшэньня бытавых умоў павінны стаць цэнтрам увагі ўсіх нашых арганізацый. IX зьезд прафсаюзаў СССР выразна гэта падкрэсьліў. Дырэктывы IX зьезду прафсаюзаў павінны быць поўнасьцю выкананы.

Ф. І.



Апаратная Аршанскага радыё-вузла.

Аб становішчы работы сярод жанчын-вылучэнак

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК КП(б)Б канстатуе, што, ня гледзячы на вялізарнейшы рост актыўнасьці працоўных жанчын, павялічэньне ўдзельнай вагі ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы, павялічэньне колькасьці іх у выбарчых органах—саветах і калгасна-каапэрацыйнай сыстэме, за апошнія часы з боку цэнтральных устаноў, раённых, партыйных і савецкіх органаў праяўлена недапушчальнае аслабленьне ўвагі да вылучэньня жанчын на кіруючую работу, замацаваньня іх на гэтай рабоце і практычнай дапамогі ў іх штодзеннай працы. Гэта стварыла рэзкае зьніжэньне ліку жанчын на кіруючай рабоце, моманты зьняцьця вылучэнак з работы без папярэдняй згоды ўраду (з 2-х старшынь РВК зараз няма ні аднэй, з 72 старшынь сельскіх саветаў працуе 29).

Разглядаючы гэта, як яўна апартуністычную недаацэнку аднэй з важнейшых задач партыі па ўцягненьні працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За праяўленьне момантаў яўнага ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду аб замацаваньні і канкрэтнай дапамозе ў рабоце вылучэнак па Сіроцінскім і Бабруйскім раёнах (па Сіроцінскім раёне з 4 жанчын—старшынь сельсаветаў не засталося на працы ні аднэй, па Бабруйскім—зьнят з працы беспадстаўна апошні старшыня сельсавету—вылучэнка бяз згоды ўраду), папярэдзіць сакратароў райкомаў і старшынь РВК гэтых раёнаў і прапанаваць ім на працягу бліжэйшага месяцу выправіць дапушчаныя памылкі, зараз-жа заняцца пытаньнямі вылучэньня работніц і калгасьніц на кіруючую работу (старшыні сельсаветаў, калгасаў, сельспажыўтаварыстваў) і замацаваньня іх, дапамагаючы ў рабоце вылучэнак.

Аддзелу кадраў ЦК праверыць выкананьне на мясцох райкомамі пастановы сакратарыяту ЦК ад 7-VIII аб вылучэньні жанчын старшынямі сельсаветаў і калгасаў.

2. Абавязаць фракцыю КП(б)Б президыуму ЦВК, Белкалгасцэнтр, Белкаапсаюз, Белпрамсаюз, ЦСПСБ і ўсе райкомы КП(б)Б у месячны тэрмін праверыць становішча вылучэньня працоўных жанчын на кіруючую савецкую, прафэсыянальную, гаспадарчую, калгасна-каапэрацыйную работу ва ўсіх раёнах і цэнтральных установах, вызначыўшы канкрэтныя мерапрыемствы па рабоце з вылучэнкамі, аказаньні канкрэтнай дапамогі, паляпшэньні ўмоў працы і быту іх і асабліва вылучэньні новых кадраў з актыву работніц і колгасьніц.

3. У мэтах практычнага ажыцьцяўленьня задач партыі і ўраду аб вылучэньні жанчын на кіруючую работу прапанаваць:

а) ЦВК правесьці куставыя курсы падрыхтоўкі жанчын старшынямі і сакратарамі саветаў у 1932 г. у палескіх і прымежных раёнах у колькасьці 100 чалавек і ў 1933 г. правесьці цэнтральныя курсы падрыхтоўкі жанчын старшынямі сельсаветаў на 300 чалавек і праз міжраённыя куставыя курсы перападрыхтаваць па 200 чалавек.

РК і РВК загадзя, у кастрычніку па ўсіх раёнах склікаць раённыя нарады жанчын, абраных у саветы і замацаваных дэлегатак па пытаньнях правядзеньня загатовак і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў;

б) Калгасцэнтру на працягу лістапада-сьнежня правесьці куставыя курсы падрыхтоўкі жанчын старшынямі калгасаў на 700 чалавек, папярэдня ў кастрычніку склікаць па ўсіх раёнах нарады калгасьніц—членаў праўленьня калгасаў і актыву па пытаньні разьмеркаваньня даходаў і арганізацыі жаночай працы ў калгасах;

в) Белкаапсаюзу ў сувязі з надыходзячымі перавыбарамі каапэрацыйнай сыстэмы, забясьпечыць падваеньне колькасьці жанчын на кіруючай рабоце па ўсіх зьвеньнях каапэрацыйнай сыстэмы і органаў грамадзкага харчаваньня, у прыватнасьці, вылучыць дадаткова ня менш 5 старшынь райспажыўсаюзаў, 200 старшынь сельспажыўтаварыстваў і 300 загадчыкаў крам. У сьнежні правесьці курсы падрыхтоўкі жанчын, працуючых на кіруючай рабоце ў органах каапэрацыйнай сыстэмы ў колькасьці на 600 чалавек, правесьці папарэдня па ўсіх раёнах раённыя нарады жаночага і каапэрацыйнага актыву па пытаньнях чарговых задач у рабоце каапэрацыі;

г) пад адказнасьць сакратароў РК забясьпечыць якасны падбор курсаў, правільнае скарыстаньне і замацаваньне скончыўшых курсы работніц і сялянак на кіруючай рабоце ў адпаведных галінах савецкай, калгаснай і каапэрацыйнай сыстэмы.

4. На чарговым пасяджэньні сакратарыяту ЦК заслухаць ЦСПСБ па пытаньнях работы саюзаў у галіне кваліфікацыі і вылучэньня работніц на прафсаюзную работу ЦП саюзаў швэйнікаў і нархарч па пытаньнях вылучэньня работніц і на гаспадарчую работу.

Культурна - бытавое абслугоў

Даць работніцам культурную лазьню, забясьпечыць іх пральняй

Цэнтральная лазьня Менску ў першым паўгодзьдзі 1932 году прапусьціла 225 тысяч чалавек замест 235 тысяч, прадугледжаных прамфінплянам. Прычына невыкананьня пляну—у няўмелай пастаноўцы работы.

Брыгада друку знайшла рад недахопаў, якія можна лёгка зьнішчыць. Ёсьць мала палічак для вопраткі ў разьдзявальнях. Частыя перапынкі ў падачы гарачай і халоднай вады. Мала кранаў, у выніку чаго ствараюцца чаргі. Чаргі былі таксама з-за адсутнасьці вады.

Не хапае інвэнтару—шаек, вешалак, лавак. Ёсьць факты, калі абслугоўваючы пэрсанал груба адносіцца да наведвальніка. У лазьні антысанітарнае становішча, асабліва ў парным аддзяленьні. На паступаючыя скарті кіраўніцтва лазьні не зварачае ўвагі.

* * *

У адным памяшканьні з цэнтральнай лазьняй зьмяшчаецца першая і пакуль адзіная мэханізаваная пральня. Гэта пральня далёка не абслугоўвае і не задавальняе запатрабаваньняў насельніцтва. З 250 тысяч штук бялізны ў месяц пральня прапускае ўсяго 40—50 тысяч бялізны працоўнага насельніцтва. Астатняя частка—гэта бялізна розных устаноў і гарнізону. Зразумела, што задача пабудовы новай мэханізаванай пральні стаіць вельмі востра.

Але брыгада ўстанавіла, што ва ўмовах данай пральні можна зрабіць шмат больш, што яна ня поўнасьцю скарыстоўвае свае вялізарнейшыя магчымасьці. Чатыры дні пральня працавала з няпоўнай нагрузкай. Брыгадзе растлумачылі, што гэта атрымалася з прычыны недавер'я з боку працоўных.

Чаму-ж працоўныя не давяраюць першай і адзінай мэханізаванай пральні? Тлумачыцца гэта проста: бялізна ў часе мыцьця трымаецца доўгі час — больш месяца. Часта бываюць выпадкі прападаньня бялізны, або замены. У выніку нядбайнасьці асобных працаўнікоў пральні бялізна часта псуецца, адрываюцца карункі і палатно. Вось прычыны таго, што пральня не карыстаецца давер'ем.

Якасьць мыцьця таксама не пахвальная. Імкнуцца тлумачыць гэта дрэнным забесьпячэньнем пральні хэмічнымі матар'ялямі.

Ёсьць магчымасьць павялічыць прапускную здольнасьць пральні па мыцьці бялізны насельніцтва амаль на 100 проц. Аб гэтым гаварыла вытворчая нарада работнікаў пральні. Але для гэтага патрабуецца больш увагі з боку кіраўніцтва.

Па лазьні брыгада прапануе ўвесьці сэансавую мойку (вызначаецца пэўны час, колькі павінен мыцца наведвальнік), тады прапускная здольнасьць павялічыцца ўдвайне. Для гэтага неабходна пераабстаўляць лазьню. У першай лазьні трэба ліквідаваць парыльню, яе можна замяніць душамі.

Неабходна перабудаваць вэнтыляцыю. Зрабіць унутраную аддзелку з каменю і цэмэнту, каб ня прышлося кожны квартал фарбаваць сьцены. Пры ўвядзеньні сэансавага мыцьця трэба пры чакальным пакоі абсталяваць невялікую цырульню.

Неабходна ліквідаваць агіднейшую спэкуляцыю венікамі і мачалкамі каля лазьні. Арганізаваць продаж іх у буфэце.

Па пральні брыгада прапануе перавесьці адну машыну для бялізны індывідуальных заказчыкаў Гэтым самым будзе значна павялічана прапускная здольнасьць.

Прафсаюзныя арганізацыі павінны сур'ёзна заняцца паляпшэньнем бытавых умоў рабочых і работніц. Трэба памятаць, што добрае бытавое абслугоўваньне дапамагае пасьпяховаму выкананьню прамфінляяну.

Брыгада: **Зальцман, Аляксютовіч, Касьцюкевіч, Розэнбэрг, Жэлнаровіч.**

Пятнаццаць пральняў... на паперы

У сьпісах гаржылсаюзу па Менску лічыцца 15 пральняў у жактаўскіх дамох. Сем з іх не працуюць і патрабуюць капітальнага рамонту. На гэта адпушчана 15 тысяч рублёў.

Гэта на сьпісах. Але як у сапраўднасьці.

Брыгада абсьледвала некалькі пральняў і знайшла малюнак жудаснай безгаспадарчасьці і абязьлічкі.

Гаржылсаюз, як высьветлілася, нічога ня робіць для паляпшэньня быту работніц. Нават тыя пральні, якія знаходзяцца ў жактах, існуюць толькі на паперы. Як скарыстаны 15 тысяч р., адпушчаныя на рамонт, таксама невядома. Але паглядзім, аб чым кажуць нам факты.

Брыгада накіравалася ў пральню на Кастрычніцкай № 6. І цікава, што ніхто з жыхароў ня ведае аб існаваньні пральні.

— Я жыву тут восем год—кажа адзін з жыхароў, а каб была пральня, ня ведаю.

Ва ўсім доме знайшоўся толькі адзін чалавек, які праліў сьвятло на гэту цёмную гісторыю.

— А як-жа? Была такая пральня—кажа ён, але ўжо даўно гадоў дзесяць таму назад.

А зараз у памяшканьні былой пральні хлеў. Але ў гаржылсаюзе гэты хлеў яшчэ лічыцца пральняй, на якую адпушчаны грошы на рамонт.

Ня лепшая справа і з пральняй на вуліцы Бакуніна № 3. Там такі малюнак: пральня абязьлічана. Ніхто не адказвае за яе работу. Жыхары мыюць бялізну кожны асобна. У памяшканьні бруд, печкі разбураны. Жыхары праходзяць у свае пакоі праз пральню. Старшыня жакту таварыш Бруднэр скардзіўся, што ніякія сродкі на пральню не адпускаюцца.

Тут зноў усплывае пытаньне: дзе-ж сродкі, адпушчаныя гаржылсаюзам на рамонт пральняў?

Становішча пральні на Пляцы Волі № 3—такое-ж як і ў папярэдніх. Брудна. Няма неабходнага інвэнтару. Няма вадасьцёч-

ваньне работніц—у цэнтр увагі

нага каналу і ваду прыходзіцца вычэрпваць вёдрамі.

Далей мы накіраваліся ў мэханізаваную пральню, якая па словах работнікаў гаржылсаюзу „мэханізавана па апошнім слове тэхнікі". Але да нашага вялікага зьдзіўленьня гэтае „цуда" аказалася ня многа лепшым раней абсьледваных. Па бруду і безгаспадарчасьці пральня займае першае месца. У вокнах няма ніводнай цэлай шыбы. Вадаправодныя кранты паламаны. З трох катлоў карыстаюцца толькі двума. Трэці напоўнен вадой, якая ўжо заплесьнявела. Сушылка не працуе. У гладзільным аддзяленьні жывуць прыватныя жыхары. Электрычныя прасы бязьдзейнічаюць. Каналізацыя ня спраўна, таму памяшканьне часта заліваецца вадой. Няма адказнага за пральню, таксама няма сталага штату. Кожны ў паасобку мые сабе бялізну.

Пры добрай і нармальнай рабоце пральня можа выпускаць за 8 гадзін тысячу штук бялізны. Фактычна-ж мыецца толькі 100 штук. Дэзынфэкцыйная камэра ня раз прасіла жакт перадаць ім пральню, або дазволіць абслугоўваць яе. Яна абяцала адпусьціць дровы і мыла, але праўленьне жакту адмовілася.

— Няхай пральня не працуе, але яна наша. А штат непатрэбен, бо з ім толькі клапоты,— так разважае праўленьне жакту.

Замест таго, каб даць магчымасьць работніцам вызваліцца ад цяжкай працы па мыцьці бялізны, праз гэту добра абсталяваную пральню праўленцы і гаржылсаюз бязьдзейнічаюць, і зусім не скарыстоўваюць наяўныя магчымасьці.

Мы патрабуем ад пракуратуры прыцягненьня да адказнасьці праўленьня гаржылсаюзу за нядбайныя і агідныя адносіны да бытавога абслугоўваньня работніц. Гаржылсаюз павінен даць адказ, куды дзяваліся сродкі, адпушчаныя на рамонт пральняў.

Пральні—гэта важная справа, якая вызваляе работніц ад хатніх клопатаў. Гэтым самым яна дапамагае работніцам лепш выконваць прамфінплян і заняцца грамадзкай работай. Гэта важная справа ў гаржылсаюзе была на апошнім пляне. Замест сапраўднага наладжаньня работы пральняў праўленьне гаржылсаюзу займалася „очковтирательством". На паперы існуюць усе пральні і адпушчаны сродкі на іх рамонт, а ў сапраўднасьці ні адна з іх не працуе.

Гаржылсаюз ня выконвае дырэктывы партыі аб паляпшэньні бытавых умоў рабочых. З гэтай важнай справай кіраўніцтва гаржылсаюзу ня справілася.

Брыгада: **Мартайгінец, Леў.**



Загадчыца ясьляй калгасу „Пралетарская перамога" Барысаўскага р-ну т. Любасей.

Ліквідаваць агідныя зьявішчы ў ясьлях шчотачнай фабрыкі

Ясьлі № 9 пры шчотачнай фабрыцы працуюць дрэнна. Загадчыца ясьлямі, доктар і ўвесь пэрсанал недобрасумленна адносяцца да работы.

У часе прыёму—дзеці бяз усякага догляду. У групе няма сястры, бо яна на прыёме. Дзеці прадастаўлены самі сабе і часта зьбіваюць адно другое.

Раніцою ў ясьлях заўсёды брудна. Гэта робіць жудаснае ўражаньне. Ідучы на работу, *матка* заўсёды хвалюецца за сваё дзіця.

Пэрсанал ясьляй груба адносіцца да дзяцей. І таму малышы неахвотна ідуць у групу.

Калі заяўляюць доктару аб недахопах, то ў яе заўсёды адзін адказ: „У нас лепшых работнікаў няма і таму мы павінны маўчаць". Зразумела, што такі адказ ня можа задаволіць работніц. Калі гэта новыя працаўнікі, іх трэба перавыхоўваць і навучыць добрасумленна працаваць, а не маўчаць.

Нядайна быў абураючы факт. Мылі начныя гаршкі кіслатой і, не прамываючы гатаванай вадой, на іх саджалі дзяцей. У дзяцей атрымаліся раны ад апёку. Яны хварэлі з павышанай тэмпэратурай.

Другі факт. Адно дзіця днём само пайшло дамоў і да прыходу мацеры ня ведалі, што яго ў ясьлях няма. Можна сабе добра ўявіць абурэньне мацяры гэтага дзіцяці. Добра, што дзіця прышло дамоў і не папала пад трамвай.

Харчаваньне вельмі дрэннае і ніхто не клапоціцца аб яго паляпшэньні. Фабком шчотачнай фабрыкі зусім ня цікавіцца ясьлямі. Наогул фабком не займаецца пытаньнем бытавога абслугоўваньня работніц.

Зразумела, што гэтыя абставіны ўплываюць на якасьць працы работніц, на выкананьне імі прамфінпляну. Але гэта зусім ня турбуе кіруючыя арганізацыі шчотачнай фабрыкі.

Мы патрабуем ад трыкутніка шчотачнай фабрыкі—неадкладна заняцца пытаньнем работы ясьляй, забясьпечыць іх харчамі. Кіраўніцтва ясьляй трэба неадкладна зьмяніць, каб аздаравіць работу ясьляй.

Брыгада: **Вайнштэйн, Крывашэіна.**

Ад рэдакцыі. **Рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" чакае тэрміновага адказу ад партколектыву шчотачнай фабрыкі, што зроблена па ліквідацыі агідных зьявішч у ясьлях і забесьпячэньні іх харчаваньнем.**

ФАБРЫКА ІМЯ КРУПСКАЙ ПАВІННА ВЫКАНАЦЬ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ, УЗЯТЫЯ Ў АДКАЗ ЛЕНІНГРАДЦАМ. ПРАРЫЎ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЛІКВІДАВАНЫ

У трэцім цэху ліквідавана цякучасьць рабочай сілы

(Ліст рэдактара шматтыражкі)

На швэйнай фабрыцы імя Крупскай (Менск) зараз праходзіць штурм па ліквідацыі прарыву. Абвешчан конкурс на лепшую гасладарча-разрахунковую брыгаду, істужку і цэх па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну.

Для ўключэньня ў конкурс шматтыражка правяла нараду цэхавых рэдкалегій. Абгаварваліся практычна задачы штодзённак у конкурсе. Штодзенкі другога і трэцяга цэхаў, якія да гэтага часу бязьдзейнічалі, пачалі зараз выходзіць сваячасова.

Матар'ял брыгады друку аб цякучасьці рабочай сілы, які зьмешчан у № 26 за 1932 год нашай часопісі і ў фабрычнай шматтыражцы, узварушыў усю грамадзкасьць фабрыкі. Па ўсіх цэхах створаны тройкі па барацьбе з лятунствам, прагуламі і спазьненьнямі на працу. У трэцім цэху, дзе брыгада правяла сход, зусім зьнішчана цякучасьць рабочай сілы. Амаль ліквідаваны прагулы і спазьненьні на работу. У першым і другім цэхам яны зьменшыліся.

Падцягваецца і сталоўка. Якасьць абедаў крыху палепшылася. Зараз ЗРК прыступіў да выдачы рабочым бульбы і гародніны.

Усё гэта гаворыць аб тым, якое вялікае значэньне мае друк у справе арганізацыі рабочых на выкананьне прамфінпляну і наогул усіх мерапрыемстваў партыі. Друк выкрывае недахопы, дапамагае іх зьнішчаць. Заметка брыгады выклікала ў многіх работніц зацікаўленасьць друкам.

Да гэтага часу на нашай фабрыцы яшчэ ёсьць вялікі прарыў у выкананьні прамфінпляну. Мы ўзялі на сябе рад абавязацельстваў па конкурсу і ў адказ Ленінградзкім рабочым. Гэтыя абавязацельствы павінны быць выкананы. Трэці цэх ідзе ўпарадзе, па ім павінны раўняцца ўсе цэхі фабрыкі.

Прарыў павінен быць ліквідаваны.

Язьмір.

Зьнішчыць безгаспадарчасьць і абязьлічку ў другім цэху

Другі цэх фабрыкі імя Крупскай раней працаваў ня дрэнна. Але гэта ў мінулым. Зараз вельмі слаба разгорнута праца па конкурсу. Прамфінплян ня выконваецца. Якасьць прадукцыі дрэнная.

Прычына невыкананьня прамфінпляну—гэта вялікая цякучасьць рабочай сілы і прагулы.

Тав. Шульман—лепшая ўдарніца якасьці 3-га агрэгату ф-кі „Кастрычнік".

Недахват рабочай сілы вымушае перакідваць рабочых з аднэй работы на другую. Гэта адбіваецца на якасьці прадукцыі. Да гэтага трэба яшчэ дадаць, што працдысцыпліна ў цэху слабая. Цэхавая адміністрацыя мала змагаецца з гэтым.

Некаторыя работніцы: Шэфчык, Міклуж, Стафэева, Баранбаум, Кандрацёнак і Скрыпка зусім ня цікавяцца працай. Яны нядбайна адносяцца да яе.

Мэханікі таксама нядбайна адносяцца да работы. Адрамантаваных запасных машын ніколі няма. Мэханік Ярашэвіч сварыцца з работніцамі, калі яго клічуць рамантаваць машыну.

За апошні час у цэху разгорнута праца па барацьбе з лятунамі і прагульшчыкамі. Прозьвішчы прагульшчыкаў вывешваюцца на чорнай дошцы і плякатах. Працуе тройка па барацьбе з лягунамі і прагульшчыкамі. Гэта мае добры ўплыў.

Нельга не адзначыць безгаспадарчасьці ў цэху. Нагавіцы валяюцца без паясьніц у той час, як мэханікі чысьцяць паясьніцамі машыны. Касавароткі валяюцца без рукавоў. Майстры і некаторыя інструктары ня прымаюць ніякіх мер да зьнішчэньня гэгых агіднасьцяй.

У гаспадарча-разрахунковых брыгадах няма ніякай эканоміі фарнітуры. Ніткі, гузікі і тасьма раскіданы па падлозе. Няма ніякага ўліку. Фарнітура не замыкаецца і ніхто за яе не адказвае.

Санітарнае становішча цэху нікуды ня годнае. Уборка праводзіцца ў часе працы. Усюды поўна пылу, на сьценках вісіць павуціньне. Вешалкі няма. Польты валяюцца дзе папала з-за чаго разьвялося многа паразітаў. У баках часта няма вады.

Усе гэты абураючыя недахопы павінны быць неадкладна зьнішчаны. Трэба памятаць, што ўсе гэтыя непаладкі ўплываюць на выкананьне прамфінпляну.

Трэба неадкладна разгарнуць масавую работу ў цэху па конкурсу, рашуча змагацца з безгаспадарчасьцю, лятунамі і прагульшчыкамі. Другі цэх павінен заняць тое месца па выкананьні прамфінпляну, якое ён займаў раней.

Брыгада друку: **Жукава, Расоўская, Кураж, Лапатка, Юркавец, Рубенчык.**

ПРАЗ ДЭЛЕГАЦКІЯ СХОДЫ МАБІЛІЗУЕМ РАБОТНІЦ, КАЛГАСЬНІЦ І ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН НА ВЫКАНАННЬНЕ ПЛЯНАЎ 4-га ЗАКЛЮЧНАГА

Трэба прымусіць партком фабрыкі „Кастрычнік“ выконваць дырэктывы партыі ў галіне жанработы

На фабрыцы „Кастрычнік“ (Менск) жанработа зусім не праводзіцца.

Да выбараў дэлегатак на фабрыцы яшчэ не прыступілі. На запытаньне ў сакратара парткому тав. Каца, калі будуць выбары, ён адказаў: „Чаго мне сьпяшацца. У мяне ёсьць час“.

Работ ікі фабрыкі „Кастрычнік“ зусім забываюць, што на прадпрыемстве большасьць новых работніц. Яны забываюць, што лепшая форма выхаваўчай работы—гэта дэлегацкія сходы, якія сябе апраўдалі на працягу раду год.

На фабрыцы „Кастрычнік“ існуе такая думка, што на прадпрыемстве большасьць жанчын, а таму жанработы ня трэба весьці, бо работніцы ўцягнуты ў агульнамасавую работу.

Дырэктывы партыі ясна гавораць, што дэлегацкія сходы павінны працаваць на ўсіх прадпрыемствах, у тым ліку і на тых, дзе большасьць працуючых жанчын. Гэта дырэктыва парткалектывам фабрыкі „Кастрычнік“ ня выконваецца.

Нядаўна на фабрыцы адбыўся сход маладых рабочых, на якім прысутнічала 250 чалавек, было ўсяго 40—50 работніц. У ліку выступаўшых ня было ні аднэй жанчыны. Пытаньне быту і чуласьці да работніц былі закрануты рабочымі, а не работніцамі.

Факт, што ні адна работніца, не выступала ярка сьведчаць аб адсталасьці работніц і яшчэ раз сьведчыць аб няправільнасьці цьверджаньня паасобных працаўнікоў фабрыкі, што работніцы дастаткова ахоплены масавай працай. Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы жанработы. Трэба прымусіць партком фабрыкі „Кастрычнік“ выконваць дырэктывы партыі і хутчэй правесьці выбары дэлегатак.

Е. Э.

Разгортваем работу

Вельмі цяжка сабраць на сход работніц цагельні № 1 (Менск). Тав. Чаўбеевай (культработніку) з вялізнымі труднасьцямі прыходзіцца праводзіць розную работу сярод жанчын. Але сёньня ня так, як заўсёды.

На дварэ цагельні бегатня, усе ідуць у клюб. Выбары дэлегатак—нязвычайная тут справа. Работніцы яшчэ слаба выказваюцца, за ўвесь час іх працы гэта ў іх першы сход. Але рэплікі ў часе сходу сьведчаць аб тым, што жаданьне да працы ёсьць. З вялікай цікавасьцю работніцы выслухалі даклад аб задачах дэлегацкага сходу, уносіл, заўвагі, прапановы. Выбралі дэлегатак, але гэта толькі пачатак, а зараз трэба разгарнуць сыстэматычную работу з імі.

К.

Прыкладны дэлегацкі сход

Дэлегаткі станцыі Рэчыца падпісаліся на пазыку на 525 руб. Жонкі рабочых і служачых для выплаты пазыкі працавалі на пагрузцы вагонаў і выплацілі ўсю пазыку. Дэлегаткі абавязаліся правесьці падпіску на пазыку і сярод іншых жанчын.

Дэлегацкім сходам былі арганізаваны брыгады па дапамозе ва ўборачнай і праполачнай кампаніі саўгасам—прыгараднаму і Жмурэўскаму. Зараз дэлегаткі рыхтуюцца для дапамогі саўгасам па ўборцы бульбы.

Дэлегацкі сход мае добры актыў. У нядаўна адкрыты на станцыі ларок загадчыцай вылучана дэлегатка.

У бліжэйшы час на станцыі Рэчыца будуць адкрыты сталоўка і буфэт, дзе ўвесь абслугоўваючы пэрсанал будзе вылучан з жонак рабочых і служачых.

Асабліва актыўна працуе дэлегатка **Міманава**, якая ахапіла падпіскай на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ ўсіх дэлегатак, жонак рабочых і служачых. Другія дэлегацкія сходы павінны ўзяць прыклад з працы дэлегацкага сходу станцыі Рэчыца. Неабходна толькі, каб парт'ячэйка не паслабляла кіраўніцтва сходам. Неабходна таксама дабіцца таго, каб дзіцячая пляцоўка працавала і ў зімовы час.

Гудкова.

Дэлегаткі—ударніцы фінфронту

Таварыш **Мацьвеенка**—былая батрачка (зараз прыбіральшчыца клюбу чыгункі, кандыдат партыі). Яна зьяўляецца актыўнейшай дэлегаткай і ўдарніцай фінфронту.

Тав. Мацьвеенка рэалізавала пазыку „4-ты завяршальны“ сярод хатніх гаспадынь на 550 р. Яна таксама завербавала 25 падпісчыц на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“.

Дэлегаткі-актывісткі! Бярэце прыклад ад Мацьвеенкі.

г. Крычаў. **Галя.**

Тав. Беланоўская—работніца ф-кі „Камунарка“, актыўная дэлегатка.

ФРЫДА МУЛЕР

Да мэты

(*Працяг*)

На вуліцы Маня загадала ўсім строіцца ў рады.

— Раз, два, раз, два,—падаў каманду Тодар, як сапраўдны камандзір. Каля будынку саюзу ўжо ня мала было людзей. Маня ўвайшла ў будынак і праз некалькі хвілін вярнулася з чырвоным сьцягам, які яна вышыла ў падвале ў часе белапольскай акупацыі.

Як толькі скончылася дэманстрацыя, Маня, Аляксандар і яшчэ некаторыя камсамольцы і камсамолкі накіраваліся ў будынак, прызначаны для майстэрні.

Маня з таварышкамі-камсамолкамі пачала ўбіраць пакоі. Аляксандар і Хведар насілі ваду, выносілі горы сьмецьця, якім было завалена ўсё памяшканьне.

Маня з чорнабровай Фанькай падзялілі паміж сабой працу. Маня мыла вокны. Працавала яна хутка, моўчкі.

Хутка варушыліся яе рукі, яшчэ больш хутка варушыліся думкі ў яе галаве.

У яе думках складаўся плян працы майстэрні, плян партмасавай працы.—У дзень будуць шыць вопратку, увечары тут будуць кавацца новыя думкі, будуць абмяркоўвацца шляхі да новага жыцьця, — так думала Манька і выразна ўжо зараз бачыла, як вечарамі ў майстэрні працавала школа.

А праца кіпела. Аляксандар прачышчаў машыны, Хведар дапамагаў чорнабровай Фаньцы. Яна мыла дзьверы ды, жартуючы, пырскала вадою на Хведара і тады малады гучны сьмех далёка праз вокны разьліваўся ў паветры.

Урэшце, Хведар ня вытрымаў, схапіў яе рукі, скруціў іх назад. Фанька варочалася ў яго моцных руках і яшчэ гучней сьмялася... Адалі, змарыўшыся ў барацьбе з Хведарам, як дзіцё пачала прасіць: „Хопіць, Хведарка, пусьці-ж мяне, ну пусьці, больш ніколі ня буду“...

— Ды пусьці-ж ты яе, бачыш яна ужо плакаць зьбіраецца,— зьвярнуўся Аляксандар да Хведара насьвістваючы песьню:

„Все пушки, пушки грохотали,
трещал наш пулемет,
пильсудчики отступали,
а красные вперед“.

Усе хорам падхапілі песьню

Нясуць швэйныя машыны.

Аляксандара. Пакой напоўніўся сьпевамі, сьмехам. Дзьверы шырока расчыніліся, увайшла камсамолка Хайка з новай „Зінгераўскай“ машынай.

У майстэрню сталі зьбірацца рабочыя і саматужнікі. Прыходзілі ўсе, каму толькі хацелася. Ведалі яны, што будуць гутарыць пра работу вайскова-абмундзіравальнай майстэрні.

— Лёўка, можа і ты сваіх пару машынак прынясеш,—зьвярнуўся Аляксандар да рыжага Лейбкі,— у цябе-ж ёсьць дзьве машыны!?.

— Яшчэ можа і жонку сваю вам аддаць,—крыкнуў раззлаваны Лейба,—бач, што надумаліся.

— Жонку сваю сабе трымай, яна нам не патрэбна; але машыны твае вельмі патрэбны,— адказаў Аляксандар.

— Каб я да вас шыць прыходзіў?! Не дажывяцё вы да гэтага! Я кваліфікаваны рабочы; шыў вопратку, для генэралаў і графаў, а зараз пайду працаваць да гэтых абарванцаў?!—Ніколі гэтага ня будзе!

Вакол рыжага Лейбы сабраўся натоўп людзей.

— Так, так давай ім мацней— паддаваў жару Лэйбку малы крываногі Нахман.

— Цішэй, не гарачыся. З такім, як ты, мы ня зьбіраемся будаваць майстэрні,—супакойвала Лэйбку Манька,—будзе час—самі прыдзеце...

— Я да вас прыду прасіцца на працу?!. крыкнуў Лэйбка.

— Ня толькі вы, але і ўсе кваліфікаваныя краўцы, саматужнікі да нас прыдуць,—дадала Маня яму ўсьлед.

— Вось пачакай праз год ці два ўжо ня трэба будзе машыны нагамі круціць і вы тады ўсе да нас прыдзеце.

— Як гэта ня трэба будзе нагамі круціць, чым-жа вы іх пакруціце.

А электрычнымі маторамі,— з гонарам адказала Манька і вочы яе запаліліся радаснымі агонькамі.

Лэйбка засьмяяўся, а за ім і ўся група людзей, якая стаяла каля яго. Словы Манькі яны называли дзіцячай фантазіяй.

— Электрычнасьць ёй будзе машыны круціць?!? Ты ведаеш, што гаворыш?—зьвярнуўся Лэйбка да Манькі. А можа гэна п'яна?..

— Сам ты п'яны. Я яшчэ не звар'яцела; а машыны ўсё-ж такі будуць электрычнасьцю рухацца—гаварыла Манька.

— Здаецца, дзяўчына ня дурная, а дурнем прыкідваецца,— перабіў яе Лэйбка.—Кравецкая машына будзе электрычнасьцю круціцца??—У хуткім часе можа ўжо і зусім краўцы не патрэбны будуць?! Можа і дзеці без бацькоў народзяцца?!! Ха-ха-ха!

— Кхэ... кхэ... кхэ... закашляўся Янкель і пачаў гутарку:—Навошта

На дапамогу сёстрам па клясе

Шумна. Аркестр рытмічнымі гукамі заклікае ўсіх у зялю. Народу сабралася багата. Белыя, чырвоныя сукенкі, іх цэлае мора адразу кідаецца ў вочы.

Задача сёнешняга зьлёту—мабілізаваць работніц, жонак рабочых на справу абароны Савецкага саюзу, азнаёміць іх з рэвалюцыйнай барацьбой замежных сёстраў па клясе. Добра падрыхтаваны зьлёт скліканы па ініцыятыве жансэктару Менгаркому КП(б)Б і гаржылсаюзу праходзіць вельмі актыўна.

Пасьля дакладу адна за аднэй работніцы расказвалі аб дасягненьнях і недахопах у абарончай і мопраўскай рабоце.

— Мы павінны мацаваць абарону краіны, а між іншым мы да гэтага адносімся з халадком. Зараз я абяцаю сама стаць ініцыятарам абарончай работы ў нас на фабрыцы „Ўсход"—закончыла Гурына, работніца гэтай фабрыкі.—У любую хвіліну зможам зьмяніць варштат на вінтоўку.

Санкаманда жакту № 5 рапартавала зьлёту аб аўладаньні тэхнікай санітарнай справы, якая будзе мець у будучай вайне вялізарнае значэньне. Санкаманда ў будучым абяцала яшчэ больш упарта змагацца за аўладаньне ваеннай тэхнікай. Аб недахопах у гэтай галіне гаварылі работніцы і жонкі рабочых іншых прадпрыемстваў Менску: Нэйман—работніца „Чырвонага хэміка", Зэльцэр—хатняя працаўніца і інш.

Бурнай авацыяй, сьпевамі „Інтэрнацыяналу" спаткаў зьлёт палітзьняволеных польскіх турмаў. Тав. **Гаўрылік** ад імя прыгнечаных сёстраў Польшчы перадаў шчырае прывітаньне працоўным жанчынам Менску. У залі цішыня. З вялізарнай увагай лавілася кожнае слова палітзьняволенага, які расказваў аб жудасьцях польскіх казэматаў.

Ня гледзячы на тое, мужчына, гэта, ці жанчына, маладая, ці старая, кладуць на грудзі дошку і б'юць каменем, каб адбіць сэрца і лёгкія і потым сказаць, што ён памёр сам.

Таварышкі, вы ня ведаеце, што гэта за шчасьце быць свободнымі і будаваць новае жыцьцё. Вы павінны тут працаваць з максымальнай энэргіяй, бо за вамі сочаць прыгнечаныя Польшчы. Ведайце, што вашы посьпехі падымаюць дух, да барацьбы за справу рэвалюцыі ў працоўных за мяжою, у іх бойках з капіталізмам.

Аб рэвалюцыйнай барацьбе працоўнай жанчыны Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны гаварылі палітзьняволеныя тав. **Фрышман** (на яўрэйскай мове) і тав. **Валынец**.

Сьлёзы каціліся па тварах удзельніц зьлёту, выслухоўваючы жудасьці жыцьця жанчын замежных краін у параўнаньні з намі, э нашымі ясьлямі, пляцоўкамі, дзіцячымі дамамі.

Дружна была падхоплена прапанова ўдарніцы фабрыкі імя Крупскай аб зборы грошай у карысьць сем'яў палітзьняволеных.

— Мы ведаем,—кажа т. Бухман,—што наша дапамога падымае дух рэвалюцыянэраў і іх сем'яў. Вылучаныя тут-жа брыгады за некалькі хвілін сабралі 109 р. Грошы пераданы ў МОПР.

Удзельніцы зьлёту абавязаліся ўзмацніць абарончую работу, узорна паставіць работу ячэяк МОПР'у Менску.

Позна ўвечары разышліся ўдзельніцы зьлёту з цьвёрдай думкай—заўтра-ж каля варштату праводзіць у жыцьцё рашэньні зьлёту.

К.

Дэманстрацыя бастуючых тэкстыльшчыкаў у Ланкашыры (Ангельшчына).

ДА МЭТЫ

(Працяг)

злавацца, пажывем дык убачым, а зараз авансам крычаць ня трэба. Кхэ... кхэ. Янкель хварэў і пасьля кожнага слова кашляў.

Лэйбка ніяк ня мог супакоіцца; ён—стары кваліфікаваны кравец—ніяк не хацеў згадзіцца, што яго машына можа круціцца электрычнасьцю.

— Вось табе і баба, бачыш, чаго захацела?! Каб была магчымасьць усе-б косьці пераламаў, Лэйбка ботамі стукнуў у дзьверы і вышаў.

Ужо сабраліся рабочыя, работніцы... Пакой поўны людзьмі, дымам, гоманам.

— Аляксандар, пачынай сход, дакуль чакаць будзеш,—крычалі з усіх бакоў.

Аляксандар пачаў гаварыць пра становішча на фронце. Яго бледны твар пар\жавеў, вялікія чорныя вочы блішчэлі.

Пасьля Аляксандра гаварыла Маня. Яна дала малюнак гераічнага пераможнага наступленьня Чырвонай арміі.

— Яшчэ адзін дзень, яшчэ дзянёк і Беларусь белапанская стане Беларусьсю Савецкай!

Грукат аплёдысмэнтаў ускалыхну ў паветра.

— Не кажы „гоп", не перескочыўшы. Пакуль вайна ня скончана, яшчэ невядома, хто застанецца спадаром Беларусі,—ціха сказаў крываногі Нахман і поўнымі злосьці вачыма зірнуў на Маню.

— Перамога будзе за Чырвонай арміяй,—працягвала Маня сваю прамову,—мы ёй дапаможам,

Дапаможам... несьліся галасы з розных куткоў пакою.

(Праця² будзе)

1568

Сьвіньні даглядаюцца дрэнна

Саўгас „Васільлеўск“ (Гомельскі раён) мае каля двух тысяч сьвінога пагалоўя. Але трэба сказаць, што гэта вялікае стада на сёнешні дзень ня мае належнага догляду. Асабліва дрэнна ў саўгасе даглядаюць маладняк і паросных матак. Часта яны паросяцца тут-жа ў агульных стойлах, з прычыны чаго многа гіне маладняка.

Шмат сьвіней хварэе паносам, паратыфам. Хворыя не адлучаюцца ад здаровых.—У выніку павялічваюцца захворваньні. Вэтдоктар нават і ня думае прымаць ніякіх мер, каб ізаляваць хворую жывёлу ад здаровай.

Работнікі сьвінарніка, на чале са старшым сьвінаром, нядбайна адносяцца да выкананьня сваіх абавязкаў. Напрыклад старшы сьвінар цэху халастых матак Каленьнікаў працуе вельмі нядобрасумленна. У стойлах брудна, паросныя сьвіньні стаяць разам з кормнымі. Каленьнікаў ніколі ня ведае, што ў яго сьвінарніках робіцца.

Ёсьць і такія работнікі, якія сумлена выконваюць свае абавязкі, добра даглядаюць сьвіней і маюць добрыя вынікі працы. Сьвіньні прыбываюць звыш нормы, а гэта ўплывае на павышэньне зарплаты абслугоўваючага пэрсаналу. Да такіх ударнікаў адносяцца старшая сьвінарка **Бацушына і Цімонава,** якія за добрую працу штомесячна замест 48 руб.—атрымліваюць 90 руб. Але на жаль гэтыя добрыя паказальнікі працы не папулярызуюцца, не перадаюцца іншым. Ні прафарганізацыя, ні дырэкцыя ў гэтай галіне нічога ня робяць. Калі і надалей засганецца такое становішча, то саўгас ня здолее справіцца з задачамі, якія перад ім пастаўлены. Трэба, каб паргыйная і прафсыянальныя арганізацыі саўгасу неадкладна зацікавіліся становішчам сьвіной фэрмы.

С. К.

Ад рэдакцыі: Рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“ чакае адказу ад кіруючых саўгасных арганізацый, што імі зроблена для ліквідацыі ўказаных недахопаў.



Сілосная башня на 300 тону калгасе імя Калініна (Аджарыстан).

Ярмаловіч заслугоўвае прэмію

Калгасьніца сьвінарка **Ярмаловіч** Палагея з калгасу „Чырвоны штурм“ (Александрыйскі сельавет, Шклоўскі раён) узялася даглядаць 40 штук парасят ад 5 сьвінаматак і дзякуючы добраму догляду выхавала ўсіх. Адыходу зусім няма.

Ярмаловіч штодзенна клапоціцца аб парасятах, каб яны былі сваячасова дагледжаны, каб было чыста і суха ў сьвінарніку.

Праўленьне калгасу павінна прэміяваць Ярмаловіч, як лепшую ўдарніцу сьвінатаварнай фэрмы.

Пр-ка.

Дабіцца адказнасьці ў працы

На СТКФ калгасу „Чырвоная ніва“, Асіпавіцкага раёну, адсутнічае належны догляд сьвіней. Пастаянных брыгад па даглядзе сьвіней на фэрме няма. Іх даглядаюць па чарзе. У выніку гэтага на фэрме пануе поўная безгаспадарчасьць.

Вінаватыя ў пакражы на фэрме трох цэнтнэраў высевак да гэтага часу не пакараны.

Сьвіньні кормяцца бяз усякіх нормаў. Таксама адсутнічае санмінімум. Загадчык фэрмы т. **Маліноўскі** не клапоціцца аб доглядзе сьвіней. У сьвінарніках бруд. Гэта спрыяе вялізнаму адыходу. Для кармленьня парасят адпускаецца малако, але-ж ўліку яго нікто не вядзе.

Райкалгассаюз, які да гэтага часу нічога не зрабіў у напрамку паляпшэньня работы фэрмы, павінен зараз-жа рэагаваць на такое становішча.

П.

ЗДАВАЙЦЕ
ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ
РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ
ЛІСТАНОСЦАМ
АБО
НА ПОШТУ
ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
3 РАЗЫ
Ў МЕСЯЦ
КАШТУЕ 20 КАП.
АДРАС РЭДАНЦЫІ:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63,
3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.

Выданьне ЦК КП(б)Б 206618 17163/XII Адк. рэдактар Э. ШАПІРА.

Друкарня імя Сталіна Заказ № 2409 У ліку 7 860 экз. Ул. Галоўлітбелу № 3—4